Камуністычная партыя (бальшавікоў) Беларусі

ЗЬВЯЗДА

Орган Цэнтральнага і Менскага Камітэтаў КП(б)Б

СЬНЕЖАНЬ 21 1932 г. № 284 (4536)

Год выдавьня XVI

Пралетары ўсіх краёў, злучайцеся!

Забастоўка 10.000 чыгуначнікаў у Індыі

СТАМБУЛ, 14. Забастоўка рабочых у чыгуначных майстэрнях кампаніі «Мадрас Энд Саўтонмахарата Рэйлей Компані» каля Мадрасу, якая пачалася 24 кастрычніка, пашыраецца, захопліваючы рабочых буйнага чыгуначнага цэнтру Хублі, дзе да забастоўкі ўжо далучылася 3.000 рабочых. Агульная колькасьць бастуючых дасягае 10.000 чал.

Як паведамляе газэта «Гіндустан Таймс», над вёскамі каля Перамбуру, дзе жывуць бастуючыя, паказаліся аэраплены, якія расьсіпалі лятучкі з заклікам да адмаўленьня работы. Бастуючых чыгуначнікаў падтрымліваюць рабочыя іншых індыйскіх чыгунак і рабочыя розных галін гаспадаркі. Паводле вестак «Бомбей Кронікль», на працягу апошніх двух год на чыгуначным транспарце ў Індыі скарочана 43.000 рабочых, работы-ж час павялічан. 100.000 рабочых было скарочана ў іншых галінах прамысловасьці з адначасовым скарачэньнем заработнай платы для пазасталых.

ПЕРАЛОМУ У ЗАГАТОУКАХ УСЕ ЯШЧЭ НЯМА

Пералом павінен быць дасягнут напружаньнем усіх сіл партыйнай арганізацыі!

Пляны загатовак павінны быць выкананы поўнасьцю і ў тэрмін!

Пакончыць з гнілым лібэралізмам

У загатоўчай рабоце па ўсіх аспоўных відах сельгаспрадукцыі ўсё яшчэ няма неабходнага пералому. Ня гледзячы на рад прынятых ЦК мер, ня гледзячы на катэгарычныя пастановы сьнежаньскага пленуму ЦК КП(б)Б, дагэтуль у загатоўках няма яшчэ рашучага зруху. Мы павінны з усёй пэўнасьцю і рэзкасьцю падкрэсьліць, што хоць ураджай сёлета лепшы, чым летась, а загатоўчыя пляны значна меншыя, тэмпы загатовак у гэтым годзе рэзка адстаюць ад тэмпаў мінулага году. Стварылася рэальная пагроза зрыву выкананьня дзяржаўных загатоўчых плянаў ва ўстаноўленыя тэрміны.

Мы павінны зноў і зноў з усёй рашучасьцю падкрэсьліць, што няма абсалютна ніякіх аб'ектыўных прычын, якія маглі-б колькі-небудзь апраўдаць такое ганебнае становішча загатоўчай работы. Асноўная прычына адставаньня цэлага раду раёнаў і рэспублікі ў цэлым заключаецца перш за ўсё ў галоўным чынам у бястурботных, гнілых лібэральна - апартуністычных адносінах да такога важнага пытаньня, як выкананьне дзяржаўных загатоўчых плянаў з боку партыйных і савецкіх арганізацый як у цэнтры, так і на месцах.

Патураньне кулаку, які пралез у калгас, каб шкодзіць калгаснай гаспадарцы знутры, ігнараваньне аднаасобнага сэктару, на які ў БССР падае больш паловы загатоўчых плянаў, гнілыя лібэральныя адносіны да невыкананьня цьвёрдых заданьняў кулацка-заможнымі гаспадаркамі і да спэкуляцыі на рынку збожжам, — вось дзе прычыны пашага адставаньня ў загатоўках.

Барацьба за збожжа, за лён, за бульбу, за мяса — за сваячасовае і стопроцантнае выкананьне цэнтралізаваных загатоўчых плянаў не ўсьвядомлена, як важнейшая задача дня. Партыйныя і савецкія арганізацыі не зразумелі, што клясавы вораг хаця і разгромлен, але яшчэ недабіты, што кулацтва, граючы на індывідуалістычных, дробна-ўласьніцкіх перажытках адсталай часткі калгаснікаў, аказвае ўпартае супраціўленьне сацыялістычнаму наступленьню, што іменна ў галіне загатовак адбываецца зараз найбольш жорсткая клясавая барацьба.

Больш таго, у партыі нямала пераражэнскіх элемэнтаў, якія аказваюць простую дапамогу кулаку ў сабатажы загатовак. Аб гэтым красамоўна сьведчыць становішча ў Талачынскім раёне, аб якім мы ўжо пісалі, а таксама шмат іншых фактаў зрашчваньня паасобных камуністаў з клясавым ворагам, аб якіх паведамлялася на старонках нашай газэты. Справа былога сакратара Жлобінскага райкому партыі Жыракова, а таксама справы кіраўнікоў Нараўлянскага, Лоеўскага, Чырвонапольскага і Чачэрскага раёнаў паказваюць, што простыя дапаможнікі кулака дзе-ні-дзе праўраліся навет у раённы партыйны апарат. Кулацкія агенты Жыракоў і інш. пастановай ЦКК выключаны з партыі. Такі-ж лёс павінен напаткаць усіх іншых кулацкіх агентаў і падпявал.

Барацьба на загатоўчым фронце зьяўляецца баявым экзэмэнам для кожнай партыйнай арганізацыі, для кожнай партыйнай ячэйкі, для кожнага паасобнага камуніста.

Толькі ачысьціўшы рады партыі ад пераражэнскіх элемэнтаў, ад элемэнтаў, якія трасьліся з клясавым ворагам, перашкаджаюць нашай барацьбе за пляны, не жадаюць змагацца на чале мас за сапраўднае ажыцьцяўленьне генэральнай лініі партыі, — кампартыя Беларусі пасьпяхова справіцца са сваімі задачамі.

Неабходна хутка і рашуча пакончыць з гнілымі лібэральнымі адносінамі да загатоўкай работы, з апартуністычнымі самацёчнымі настроямі і на справе дабіцца таго, каб «лёзунг дыктатуры пралетарыяту не апаганьваўся практыкай кіселяпадобнага становішча пралетарскай улады» (Ленін).

Неабходна выкрыць апартуністаў, якія імкнуцца апраўдаць лібэральныя адносіны да загатовак геаграфічным становішчам на шай рэспубліцы. Іменна наша геаграфічнае становішча патрабуе ад нас асаблівай рэвалюцыйнай пільнасьці ў адносінах да клясавага ворага і яго малаўраў, асаблівай згуртаванасьці вакол ажыцьцяўленьня генэральнай лініі партыі і асабліва непрымірымай барацьбы супроць усялякіх спроб аслабіць моц пралетарскай дыктатуры.

Неабходна таксама выкрыць, як ворагаў партыі і савецкай улады, тыя гнілыя пераражэнскія элемэнты, якія прыкрываюць сваю антыпартыйную і антысавецкую работу фальшыва-нацыянальным сьцягам.

Перад усёй КП(б)Б стаіць зараз баявая задача—неадкладна пераключыць усе сілы на сваячасовае і стопроцантнае выкананьне загатоўчых плянаў, не ўстанаўляючы ніякай «чарговасьці» ў правядзеньні тэй ці іншай кампаніі, а адначасова змагаючыся і за збожжа, і за лён, і за бульбу, і за мяса і інш. загатоўкі.

Кулацкі сабатаж павінен быць рашуча зломан. Цьвёрдыя заданьні павінны быць неаскладна і безагаворачна выкананы.

Аднаасобны сэктар, які рэзка адстаў, а які адыгрывае вялікую ролю ў выкананьні пляну, павінен быць, мэтадамі масавай работы, мэтадамі арганізаванага націску, хутка падцягнут, з тым, каб увесь плян выканаць у тэрмін.

Калгасы павінны быць ачышчаны ад антысавецкіх і кулацкіх элемэнтаў і ўвесь калгасны актыў павінен быць мабілізован на завяршэньне загатовак у бліжэйшыя дні.

Надрукаваная сёньня намі пастанова СНК і ЦК КП(б)Б аб занясеньні на чорную дошку раду сельсаветаў за яўны зрыў загатовак, з усімі мерамі эканамічнай узьдзейнасьці, якія адсюль выцякаюць, няхай паслужыць сур'ёзнай перасьцярогай для ўсіх адсталых у загатоўках раёнаў і сельсаветаў.

Павінны быць прыняты ўсе меры супроць парушальнікаў савецкага закону, супроць тых, што гандлююць збожжам да выкананьня рэспубліканскага пляну, супроць спэкулянтаў і перакупшчыкаў. Савецкі суд абавязан сурова караць усіх ворагаў сацыялістычнай маемасьці і злосных сабатажнікаў загатовак, перакупшчыкаў і спэкулянтаў.

Загатоўчы апарат як у цэнтры, так і на месцах, павінен быць ачышчан ад чужых элемэнтаў і прыведзен у баявы парадак.

Сакратары райкомаў і старшыні райвыканкомаў павінны памятаць, што яны нясуць асабістую і поўную адказнасьць за сваячасовае і поўнае выкананьне плянаў загатовак.

На аснове разгорнутай бальшавіцкай самакрытыкі, ня гледзячы на асобы, партыйныя арганізацыі абавязаны рашуча выкрываць апартуністычных агентаў кулака, перараджэнцаў, сабатажнікаў загатовак, якія носяць у кішэні партыйны білет.

На аснове сапраўды бальшавіцкай мабілізацыі мас, апіраючыся на калгасны і бядняцка-серадняцкі актыў, рашуча напаўляючы сапраўдзіўленьне кулацкіх элемэнтаў, прыводзячы ў рух усе сілы партыйнай і камсамольскай арганізацыі, бязьлітасна выганяючы з нашых радоў апартуністаў і перараджэнцаў, кампартыя Беларусі пасьпяхова завершыць выкананьне загатоўчых плянаў.

Аб занясеньні на чорную дошку вёсак, якія злосна сабатуюць загатоўкі

Пастанова СНК БССР і ЦК КП(б)Б

Прымаючы пад увагу ганебнае адставаньне ў выкананьні загатовак па раду раёнаў БССР, СНК БССР і ЦК КП(б)Б ставяць перад РВК і РК задачу зламаць сабатаж загатовак, які арганізаваны кулацкімі і контррэвалюцыйнымі элемэнтамі, даць бязьлітасны адпор частцы вясковых камуністаў, якія сталі фактычнымі праваднікамі сабатажу, ліквідаваць несумяшчальную са званьнем члена партыі пасыўнасьць і прымірэнцтва да сабатажнікаў, забясьпечыць хуткае нарастаньне тэмпаў, поўнае і безагаворачнае выкананьне пляну загатовак.

СНК БССР і ЦК КП(б)Б пастанаўляюць:

За яўны зрыў пляну загатовак і злосны сабатаж, арганізаваны кулацкімі і контррэвалюцыйнымі элемэнтамі, занесьці на чорную дошку сельсаветы: Паўлаўскі, Сакалінскі, Няхлюдаўскі, Коханаўскі, Валжоўскі — Талачынскага раёну; Будзішчанскі і Глубачанскі сельсаветы — Чачэрскага раёну; Нядальскі, Патапаўскі і Губцкі — Буда-Кашалёўскага раёну; Каралішчавіцкі, Абчацкі і Папярнянскі — Менскага раёну.

У адносінах да гэтых сельсаветаў прыняць наступныя меры:

1. Безадкладна спыніць завоз тавараў, цалкам спыніць каапэрацыйны і дзяржаўны гандаль на месцы і вывезьці з апаведных каапэрацыйных і дзяржаўных крам усе наяўныя тавары.

2. Цалкам забараніць калгасны гандаль як для калгасаў, калгаснікаў, так і для аднаасобнікаў.

3. Спыніць усялякае крэдытаваньне, правесьці датэрміновае спагнаньне ўсіх фінансавых абавязацельстваў па даных сельсаветах.

4. Праверыць і ачысьціць органамі РСІ каапэрацыйны і дзяржаўны апарат ад чужых і варожых элемэнтаў.

5. Праверыць і ачысьціць калгасы гэтых сельсаветаў, ізьяўшы контр-рэвалюцыйны элемэнт — арганізатараў зрыву загатовак.

СНК БССР і ЦК КП(б)Б зварачаюцца з заклікам да ўсіх сумленных і адданых савецкай уладзе калгаснікаў і працоўных сялян аднаасобнікаў арганізаваць усе сілы для бязьлітаснай барацьбы з кулакамі і іх пасобнікамі на перамаганьне кулацкага сабатажу загатовак у сваіх сельсаветах, за сумленнае і сваячасовае выкананьне загатоўчых абавязацельстваў перад савецкай дзяржавай, за ўмацаваньне калгасаў.

Старшыня Савету Народных Камісараў БССР ГАЛАДЗЕД.

Сакратар ЦК КП(б)Б ГІКАЛО.

Члены сельсаветаў павінны паказаць узор барацьбы за пляны загатовак

Усім РВК, сельсаветам

Прэзыдыум ЦВК БССР адзначае, што па раёне раёнаў выкананьне загатовак ідзе нездавальняюча, прычым асобныя члены сельсаветаў, замест паказальнага выкананьня загатовак, якія прылічваюцца з іх саміх, ня выконваюць гэткіх, а некаторыя падпадаюць пад уплыў кулацка-варожых элемэнтаў, чым зрываюць загатоўкі. Прэзыдыум ЦВК БССР прапануе РВК і сельсаветам зараз-жа праверыць выкананьне членамі сельсаветаў прыпадаючых на іх загатовак, выкананьне кулацка - заможнымі элемэнтамі, а таксама бяднацка-серадняцкімі дварамі іх вучасткаў. Членаў сельсаветаў, якія самі злосна ня выконваюць загатовак, якія пад уплывам кулацка-варожых элемэнтаў сабатуюць выкананьне іх вучасткам загатовак, тэрмінова перавыбраць, аддаць пад суд за зрыў загатовак. Кожны сельсавет павінен змагацца за права рапартаваць сэсіі ЦВК БССР аб сваячасовым выкананьні загатовак.

Старшыня ЦВК БССР ЧАРВЯКОЎ.

Сакратар ЦВК БССР ГНІЛЯКЕВІЧ.

Пра меры спагнаньня за несваячасовую здачу сельска-гаспадарчых прадуктаў па дзяржаўных загатоўках

Пастанова Савету Народных Камісараў БССР ад 20 сьнежня 1932 г.

Побач з радам раёнаў, якія ўжо выканалі і пасьпяхова выконваюць дзяржаўныя загатоўкі, многія раёны БССР ганебна адстаюць у загатоўках, ня гледзячы на тое, што пляны загатовак у гэтым годзе зьменшаны ў параўнаньні з мінулым годам, што прадастаўлен рад ільгот калгасам, калгаснікам і працоўным аднаасобнікам і ня гледзячы на поўную рэальнасьць плянаў загатовак.

Нездавальняючы ход загатовак тлумачыцца слабай працай раённых выканкомаў і сельсаветаў, якія не арганізавалі адпор шкалёнаму супраціўленьню кулацка-заможных элемэнтаў і сабатажу загатовак з боку тых, якія падпадаюць уплыву кулацка-заможніцкай агітацыі.

Для пасьпяховага выкананьня ў тэрмін пляну загатовак сельска-гаспадарчых прадуктаў неабходна ўжыць меры суровага спагнаньня супроць тых злосных элемэнтаў, якія сабатуюць загатоўкі.

Выходзячы з гэтага, Савет Народных Камісараў пастанаўляе:

1. За несваячасовую здачу сельска-гаспадарчых прадуктаў па дзяржаўных загатоўках (збожжазагатовак, бульбы, мяса, ільну, сена і інш.) устанавіць штраф натурай мясам у разьмерах гадавой нормы на тыя гаспадаркі, якія ня выконваюць сваіх абавязкаў перад дзяржавай па загатоўках, спагнаючы адначасова са штрафамі і ўсе віды загатовак, якія прылічваюцца з пасяўнай гаспадаркі. Штраф накладаецца РВК па прадстаўленьні сельсаветаў і спагнаецца ў бясспрэчным парадку праз органы міліцыі.

2. Апрача таго, пазбавіць усіх ільгот, якія даны ілюкідатчыкам пастановай ЭКАСА БССР за 9 сакавіка 1932 г. «Пра кантрактацыю ільну і пяньку, ільняного і канаплянага семі ўраджаю 1932 г.» (З. З. БССР 1932 г., № 21, паст. 83) і пастановай СНК БССР «Пра загатоўкі ільну і канапель ураджаю 1932 г. (газ. «Савецкая Беларусь 1932 г., № 181, за 17 жніўня 1932 г.), калі гэтыя гаспадаркі, у тым ліку і калгасы, да гэтага часу не здаюць ва ўстаноўленыя тэрміны дзяржаве лён, які з іх прылічваецца.

Старшыня Савету Народных Камісараў БССР М. ГАЛАДЗЕД.

Кіраўнік спраў СНК і ЗКАСА БССР С. КАНДЫБОВІЧ.

Пастанова СНК СССР і ЦК УсеКП(б)

аб практычных мерапрыемствах па правядзеньні ў жыцьцё пастановы СНК СССР і ЦК УсеКП(б) ад 4 сьнежня аб пашырэньні правоў заводакіраўніцтваў у справе снабжэньня рабочых і паляпшэньні картачнай сыстэмы

1. Заслухаўшы даклады абласных і краявых сакратароў па снабжэньні, СНК СССР і ЦК УсеКП(б) канстатуюць, што мясцовыя арганізацыі вельмі нездавальняюча праводзяць у жыцьцё пастанову СНК і ЦК ад 4 сьнежня аб новых формах арганізацыі снабжэньня.

ЦК і СНК усклада́юць на сакратароў па снабжэньні ЦК нацкампартый, крайкомаў і абкомаў, на старшынь СНК рэспублік, старшынь край (абл.) выканкомаў, на дырэктароў заводаў і старшынь ЗРК усю адказнасьць за сваячасовае правядзеньне пастановы СНК і ЦК ад 4 сьнежня і абавязваюць іх забясьпечыць бесьперабойнае снабжэньне рабочых і сыстэматычна інфармаваць ЦК і СНК аб ходзе і рэзультатах правядзеньня ў жыцьцё пастановы СНК і ЦК ад 4-га сьнежня.

Каб уцякнуць якіх-бы там ні было перабояў у снабжэньні рабочых першай групы прадпрыемстваў, ЦК і СНК абавязваюць заводакіраўніцтвы гэтых прадпрыемстваў паскорыць прыёмку апарату і прадпрыемстваў ЗРК з тым, каб скончыць яе не пазьней 28 сьнежня 1932 г.

Прыёмка павінна правоцвіцца на-ходу, не дапускаючы перарываў і перабояў у снабжэньні рабоце і ломкі апарату ЗРК пры прыёмцы. Умацаваньне і рэарганізацыя перадаваемага апарату ЗРК павінны быць праведзены ў бліжэйшыя два месяцы ў працэсе работы аддзелаў рабочага снабжэньня прадпрыемстваў.

2. З прычыны таго, што некаторыя таварышы няправільна тлумачаць рэформу снабжэньня, як сродак пашырэньня кантынгентаў і павялічэньня норм снабжэньня, СНК і ЦК катэгарычна папярэджваюць, што рэформа ня толькі ня мае на мэце пашырэньне кантынгентаў і павялічэньне норм, а, наадварот, выходзіць з неабходнасьці скарачэньня празмерна раздутых кантынгентаў і бязумоўнага выключэньня са сьпісу снабжаемых усіх ня зьвязаных з заводам прыхлябальнікаў, маючы на ўвазе выгадаць на гэтым новыя рэсурсы харчоў й прамтавараў для паляпшэньня снабжэньня сапраўдных рабочых і сапраўдных служачых, якія неабходны для прадпрыемства.

Выходзячы з гэтага СНК і ЦК прапануюць аддзелам рабочага снабжэньня прадпрыемстваў і ЗРК сурова абмежаваць кантынгенты снабжаемых толькі рабочымі і служачымі сваіх прадпрыемстваў. Працуючыя ў паасобных прадпрыемствах і ўстановах (буданікі, ахова, настаўнікі ФЗВ і ФЗС, мэхработнікі) могуць быць прыняты на снабжэньне (павосле норм, вызначаных для гэтых катэгорый) толькі пры ўмове, што яны абслугоўваюць выключна данае прадпрыемства і толькі ў тым выпадку, калі па сваім месцы жыхарства ня могуць быць перададзены на снабжэньне іншым каапэрацыйным і гандлёвым арганізацыям. Пытаньне аб прымацаваньні работнікаў паасобных прадпрыемстваў і ўстаноў кожны раз на прадстаўленьні заводакіраўніцтваў павінна зацьвярджацца Наркамснабам або яго мясцовымі органамі, прычым работнікі іншых прадпрыемстваў, устаноў і аддзельныя асобы ні ў якім выпадку не павінны прымацоўвацца да аддзелаў рабочага снабжэньня і ЗРК.

3. Пры канчатковым устанаўленьні кантынгентаў тых, што снабжаюцца па прадпрыемствах, належыць не дапускаць штучнага раздуваньня колькасьці ўтрымаўцаў, уключаючы на снабжэньне толькі непрацаздольных бацькоў.

4. Даручыць Наркамснабу разам з Цэнтрасаюзам, НКЦяжпрамам, НКЛёгпрамам і УсеЦСПС распрацаваць у трохдзённы тэрмін інструкцыю аб канчатковым устанаўленьні кантынгентаў снабжаемых, аб парадку выдачы заборных кніжак і талёнаў, іх уліку і хаваньня.

5. Выдача студзеньскіх заборных кніжак і талёнаў павінна быць праведзена ўсюды праз прадпрыемствы і ўстановы (у тым ліку і на прадпрыемствах III-ай групы) і скончана не пазьней 28 сьнежня.

6. Для атрыманьня прадуктаў і прамтавараў рабочыя і служачыя павінны прымацоўвацца толькі да заводзкіх магазынаў. Як выключэньне, у выпадку пражываньня значных груп рабочых далёка ад прадпрыемстваў, дапускаецца арганізацыя аддзелаў рабочага снабжэньня і ЗРК сваіх аддзяленьняў і магазынаў у раёне пражываньня рабочых (па-за раёнам прадпрыемства), а таксама прымацаваньне рабочых і служачых прадпрыемства па дагаворнасьці да магазынаў аддзелаў рабочага снабжэньня і ЗРК іншых прадпрыемстваў, якія знаходзяцца ў раёне месцапражываньня гэтых груп рабочых і служачых. У гэтых выпадках заводакіраўніцтвы абавязаны весьці пайменны ўлік рабочых і служачых, прымацаваных для снабжэньня да іншых магазынаў.

У выглядзе выключэньня толькі па хлебу дапусьціць у буйных гарадоў — Маскве, Ленінградзе, Харкаве, Растове, Горкім, Баку, Сталінградзе — пайменнае прымацаваньне рабочых і служачых да агульных хлебных магазынаў па месцы пражываньня.

7. У адносінах паяных узносаў устанавіць, што: а) паявыя ўзносы рабочых 1-ай групы прадпрыемстваў пераходзяць да аддзелаў рабочага снабжэньня;

б) рабочыя першай групы прадпрыемстваў робяць сыстэматычныя спэцыяльныя ўзносы на арганізацыю рабочага снабжэньня ў палавінным разьмеры да дыфпаёў спажывецкай каапэрацыі.

8. Даручаецца ЦК нацкампартый, крайкомам і абкомам, а таксама разьмеркавальнаму аддзелу ЦК пры перадачы ЗРК прадпрыемствам:

а) забясьпечыць перадачу ўсіх кадраў ЗРК у аддзелы рабочага снабжэньня;

б) умацаваць аддзелы рабочага снабжэньня шляхам адбору праверэных і апытных работнікаў, якія працуюць на іншай рабоце;

в) перадаць аддзелам рабочага снабжэньня каапэрацыйных работнікаў, якія працавалі ў вышэйстаячых каапэрацыйных звяньнях і якія абслугоўвалі ЗРК, і іх паасобныя гаспадаркі, што перадаюцца заводакіраўніцтвам;

г) забясьпечыць перадачу частці гандлёва-каапэрацыйных работнікаў, якія падрыхтоўваюцца ў ВНУ і тэхнікумах, аддзелам рабочага снабжэньня. Цэнтрасаюз і Наркамснаб супольна з Наркамзяжпрамам, НК Шляхоў зносін і Наркамлёгпрамам павінны ўстанавіць паралак далейшай падрыхтоўкі работнікаў для аддзелаў рабочага снабжэньня ў каапэрацыйных, гандлёвых і іншых ВНУ і тэхнікумах.

9. Устанавіць, што побач з адказнасьцю заводакіраўніцтваў за Цэнтрасаюзам і яго мясцовымі органамі застаецца поўная адказнасьць на працягу сьнежня і студзеня за бесьперабойнае снабжэньне таварамі гандлёвай сеткі, якія перадаюцца ЗРК, а таксама фінансаваньне бягучых аперацый гэтай сеткі.

10. Даручыць Цэнтрасаюзу, Наркамзяжпраму, Наркамлёгпраму ў 5-дзённы тэрмін распрацаваць праект дырэктывы аб парадку работы заводакіраўніцтваў і прадпрыемстваў ЗРК тых прадпрыемстваў, дзе захоўваюцца ЗРК, а таксама мерапрыемствы па іх умацаваньні.

11. Прапанаваць Наркамзяжпраму, Наркамлёгпраму і НК Шляхоў Зносін прадставіць у тыдневы тэрмін праект пастановы аб арганізацыі пры наркаматах спэцыяльных кіраўніцтваў па рабочым снабжэньні на чале са спэцыяльнымі намесьнікамі наркомаў.

Старшыня СНК СССР В. МОЛАТАЎ (СКРАБІН).

Сакратар ЦК УсеКП(б) І. СТАЛІН.

19 сьнежня, 1932 г.

15 год ВЧК-АДПУ

Прывітаньне тав. Сталіна

Работнікам і байцом АДПУ

Прывітаньне работнікам і байцом АДПУ, якія сумленна і мужна выконваюць свой абавязак перад рабочай клясай і сялянствам Савецкага саюзу. Жадаю ім посьпеху ў складанай справе выкараненьня ворагаў дыктатуры пралетарыяту.

Няхай жыве АДПУ — абнажоны меч рабочай клясы!

І. СТАЛІН.

ДА 15-ГОДЗЬДЗЯ ВЧК-АДПУ

АДПУ і яго мясцовым органам, кіраўніком і радавым байцом шлю гарачае бальшавіцкае прывітаньне і пажаданьне як і раней цьвёрда стаяць на сваім слаўным посту аховы інтарэсаў працоўных і, руйнуючы бязьлітаснымі ўдарамі контр-рэвалюцыйных сабатажнікаў і раскрадальнікаў дзяржаўнай, а таксама калгаснай маемасьці, метка біць па рэшткам белагвардзейшчыны.

В. Молатаў.

Прывітаньне ад рэвваенсавету

Старшыні калегіі АДПУ тав. Мянжынскаму

Рэвалюцыйны Ваенны Савет СССР ад імя рабоча-сялянскай Чырвонай арміі горача вітае калегію АДПУ, усіх чэкістаў — сваіх таварышоў па сумеснай рабоце за справу сацыялізму — з 15-годзьдзем органаў ВЧК-АДПУ, слаўнага, непахільнага, зоркага вартавога і пераможнага меча пралетарскай дыктатуры.

Няхай жыве АДПУ!

Няхай жывуць чэкісты!

Няхай жыве наша вялікая бальшавіцкая партыя і яе ленінскі ЦК на чале з нашым любімым правадыром т. Сталіным!

Нам. народнага камісара па ваенных і морскіх справах і нам. старшыні Рэвалюцыйнага Ваеннага Савету СССР ГАМАРНІК.

СТОЙКІМ БАЙЦОМ-ЧЭКІСТАМ

Прывітаньне ад Маскоўскага абласнога і гарадзкога камітэтаў УеКП(б)

ВЧК-АДПУ, стойкім змагаром-чэкістам, верным абаронцам пралетарскай рэвалюцыі, грозе буржуазіі і яе агентаў у дзень 15-годзьдзя Маскоўскі абласны і гарадзкі камітэты УсеКП(б) шлюць гарачае бальшавіцкае прывітаньне!

ВЧК-АДПУ плоць ад плоці рабочай клясы на працягу 15 год яе гераічнай барацьбы за ўмацаваньне дыктатуры пралетарыяту нязьменна карысталася бязьмежнай любоўю і падтрыманьнем мільёнаў рабочых і працоўных СССР і ўсяго сьвету. Разгромленае контррэвалюцыйнае кулацтва і атрэп'е буржуазіі шукаюць новых шляхоў, каб раскрадваць грамадзкую маемасьць і перашкодзіць сацыялістычнаму будаўніцтву. У гэтай барацьбе з контр-рэвалюцыяй і кулацтвам ВЧК-АДПУ была і знаходзіцца на перадавых пастох.

Вітаючы байцоў-чэкістаў пралетары, калгаснікі, бальшавікі Масквы і вобласьці жадаюць ім і надалей каносіць удары ворагам рэвалюцыі метка і без промаху.

Сакратар Маскоўскага абласнога і гарадзкога камітэтаў УсеКП(б) Л. КАГАНОВІЧ.

Германская прэса аб новым францускім габінэце

БЭРЛІН, 19. Па думцы германскай прэсы, габінэт Поль Банкура будзе існаваць вельмі кароткі час. Разам з тым, германская прэса падкрэсьлівае, што габінэт Поль Бонкура для Германіі зьяўляецца маталажаладным. Газэты называюць Поль Банкура «ваенным сацыялістам», адзначаючы, што ён зьяўляецца інициятарам жэнэўскага пратаколу і адным з аўтароў канструкцыйнага пляну. Што датычыцца палітыкі Банкура ў пытаньні аб уплаце францускіх даўгоў Амэрыцы, дык германская прэса лічыць, што Банкур пакуль зойме чакальную пазыцыю, прыпамсі да сакавіка, калі Рузвэльт афіцыяльна зойме пасаду прэзыдэнта ПАЗШ.

Водгукі ў ПАЗШ на яўрэйскія пагромы ў Польшчы

НЬЮ-ЕРК, 19. 1.500 рабочых на працягу 3-х гадзін дэманстравалі перад польскім консульствам, пратэстуючы супроць яўрэйскіх пагромаў у Польшчы. Палісцы перашкоджалі дэманстрантам прыбліжацца да будынку консульства. У консульства была дапушчана толькі невялікая дэлегацыя, якая перадала

20 тысячная дэманстрацыя салідарнасьці з бастуючымі докерамі ў Дзюнкірхэне

ПАРЫЖ, 19. У дзевяты дзень забастоўкі докераў у Дзюнкірхене адбылася 20-тысячная дэманстрацыя дзюнкірхенскіх рабочых і служачых у знак салідарнасьці з бастуючымі докерамі.

Услед за камандай амэрыканскага судна, камандa прыбыўшага ў Гаўр галяндзкага судна «Крынсен» адпавілася грузіць і не дазвяліла гэтага рабіць пікетаўшчыкам. Аналёгічны выпадак меў месца па судне транзатлянтычнай кампаніі «Вінцлер».

Рэфармісцкая прэса амаль поўнасьцю замоўчвае забастоўку докераў і толькі часамі зьмяшчае невялікія хрыпікерскія заметкі.

Абвяржэньне пэрсыдзкай прэсы

ТЭГЕРАН, 19. Газэта «Шофаг» катэгарычна абвяргае паведамленьне аб тым, што пэрсыдзкі ўрад нібы згадзіўся перадаць на разгляд Лігі нацый канфлікт з «Англа-пэрсыдзкай Ойль Кампані» па пытаньні аб апуаваньні канцэсіі. Аўтар артыкулу лічыць гэтыя чуткі «злосным прапагандай, якая вядзецца на сроткі, атрымныя ад прозаку нафты, што зьяўляецца ўласнасьцю Пэрсіі». Аўтар артыкулу растлумачае, што пэрсыдзкі ўрад у сваёй ноце пакажа апаляцыі англійскага ўраду Лізе нацый паведаміў Англію аб позднім умяшаньні і напіску з боку Англіі па Пэрсію па пытаньні, якое зьяўляецца выключна ўнутронай справай Пэрсіі. Аўтар артыкулу піша: «Рэжым капітуляцыі даўно ўжо скасаваны ў Пэрсіі. Таму пэрсыдзкі ўрад ня можа дазволіць, каб англійскі ўрад умешваўся ва ўнутраныя справы Пэрсіі і ежыньаў мотады пазнаўшага ціску ў канфлікце паміж пэрсыдзкім міністрам фінансаў і англійскай кампаніяй, якая знаходзіцца на тэрыторыі Пэрсіі».

Зьлейшым ворагам партыі, рабочай клясы і калгаснага сялянства зьяўляецца сабатажнік збожжазагатовак з партбілетам у кішэні

Ачысьціць партыйныя арганізацыі ад апартуністаў, пераражэнцаў, кулацкіх агентаў

Рашуча пакончыць з гнілымі лібэральнымі адносінамі да выкананьня загатоўчых плянаў

Случчына набліжаецца да выкананьня пляну

СЛУЦАК. (Наш спец. кар.).

У ходзе збожжазагатовак па Слуцкім раёне за апошнія дзьве пяцідзёнкі дасягнута значнае нарастаньне тэмпаў. Калі за першую пяцідзёнку сьнежня прырост раёнаў склаў 2,5 проц., за другую — толькі 0,7 проц., дык за трэцюю пяцідзёнку гэты прырост склаў ужо 6,3 проц., за чацьвертую — 7,5 проц.

На 20-га сьнежня, паводле папярэдніх падлікаў, плян збожжазагатовак па раёне ў разьмерах 31.500 цэнтн. выкананы на 97 проц. без насеньня і на 96,5 проц. уключаючы апошнюю.

Цэлы рад сельсаветаў ужо рассіравалі свае заданьні. Да іх належаць — ПЕРШАМАЙСКІ, МУСІЦКІ, ШЫШЦІЦКІ, ГРЗСКІ, САРАГОЎСКІ, ПАЛІКАРПАЎСКІ, СЯРЭДНЯКОЎСКІ, ПРОШЧАЦКІ, СЕРАЖСКІ, УРЗЦКІ, БАКШЫНСКІ і ЛЕНІНСКІ.

Прыклад высокага ўсьведамленьня сваіх абавязкаў у адносінах да пралетарскай дзяржавы паказаў САЦЫЯЛІСТЫЧНЫ СЭКТАР. Яшчэ на 15 сьнежня калгасы, якія абслугоўваюцца МТС, далі 100,9 проц. пляну, астатнія калгасы — 100,5 проц.

Па адназобным сэктары выкананьне складае на 20 сьнежня каля 92 проц. (дакладны падлік яшчэ ня скончан), прычым прырост за апошнюю пяцідзёнку раёнпецца 8—9 проц.

Што датычыць выкананьня цьвёрдых заданьняў, дык трэба канстатаваць, што неабходны націск у гэтым напрамку быў заб'ыпечан толькі ў апошнюю пяцідзёнку, якая дала прырост паступленьня збожжа па цьвёрдых заданьнях каля 21 проц. Але і зараз яшчэ цьвёрдыя заданьні па раёне выкананы толькі на 75—76 проц.

Раён шпаркімі тэмпамі падыходзіць да выкананьня агульнага пляну збожжазагатовак. ПЕРАВАГУ ЗАБЯСПЕЧАЦЬ ТОЙ ВЫКЛЮЧНАЙ УВАГАЙ, ЯКУЮ РАЙКОМ І ПАРТАРГАНІЗАЦЫІ СЛУЧЧЫНЫ АДДАЕ Ў АПОШНІ ЧАС ПЫТАНЬНЯМ ЗБОЖЖАЗАГАТОВАК. Увесь раёны актыў кінуты ў сельсаветы, шырока разгарнулася арганізацыйна-масавая работа, спаборніцтва.

АСАБЛІВА ЗА АПОШНІЯ ДНІ РАЗГАРНУЛАСЯ БЯЗЛІТАСНАЯ БАРАЦЬБА З КУЛАЦКІМІ САБАТАЖАМІ, З АГЕНТАМІ КУЛАКА — АПАРТУЧНІСТАМІ.

Райкам апарацыйна, дыфэрэнцыявана кіруе ячэйкамі, сельсаветамі, загатоўчымі пунктамі.

У Слуцк прыбыў для кіраўніцтва збожжазагатоўкамі намесьнік старшыні ЦКК КП(б)Б тав. ТУРЛАЙ.

Далейшае ўзмацненьне націску на кулака, цьвёрдазаданьніка, бязьлітасная лома кулацкага сабатажу, непрымірымая барацьба з ашкярэтнымі носьбітамі апартунізму, далейшае разгортваньне шырокай арганізацыйна-масавай работы сярод працоўнага насельніцтва, — вось тыя асноўныя прапасылкі, якія забясьпечаць Слуцкай партарганізацыі поўную перамогу ў збожжазагатоўках.

Б. ПАПОЎ.

Гарвальскі сельсавет самы адсталы ў Рэчыцкім р-ёне

РЭЧЫЦА. (Наш кар.).

Камсамольская брыгада, выехаўшая ў Маладускі і Н. Барсуцкі сельсавет, разгарнула там шырокую масавую работу вакол збожжазагатовак. Усе камсамольцы і партыйцы прымацаваны да вучасткаў. Брыгада выпускае лісток «Рэчыцкай праўды» — «За збожжа, лён і мяса», дзе бяруцца пад абстрэл зрыўшчыкі збожжазагатовак.

На хатах злосных пэрадтыкнаў збожжа вывешваюцца плякаты: «тут жыве агент кулака, злосны зрыўшчык збожжазагатовак». Гэтыя «пашпарты» аказваюць вялікі ўплыў. Калі такі «пашпарт» быў вывешан на браме аднаасобніка Герына Шліпа, ён у той-жа дзень выказаў абавязацельства па здачы збожжа.

У выніку баявой работы камсамольскай брыгады, Маладускі і Н. Барсуцкі сельсаветы набліжаюцца да завяршэньня збожжазагатовак.

Зусім іншае становішча па Гарвальскім сельсавеце. Тут асабліва адстае аднаасобны сэктар, дзе плян выкананы толькі на 31,9 проц. У гэтым сельсавеце знаходзіцца вынная рэдакцыя «Рэчыцкай праўды», на чале з работнікам рэдакцыі тав. Куньяцовым. Гэта брыгада працуе незазвычайна. Насьценная газэта ў Гарвальскім сельсавеце не знаходзіць належнага кіраўніцтва з боку вынной рэдакцыі. Вось характэрны прыклад. У насьценгазэце зьмешчан артыкул пад загалоўкам «Ухільшчыкаў, сабатажнікаў да суровай адказнасьці». У гэтым артыкуле, адрана бязглузьдзіцы, нічога ня зноўдзеце. Атульныя фразы і тыя пісьменныя. Гэта замест таго, каб жорстка выкрываць злосных сабатажнікаў збожжазагатовак, змагацца па-баявому за выкананьне пляну.

Варта падаць зьмест артыкулу:

«Усім вядома, што на чырвоную дошку трапіла рад бедняцкой і яшчэ стаіць у чарзе рад іншых кандыдатаў да 100 проц. выкананьня збожжазагатовак, але-ж нарэшце з гэтым ёсьць рад таварышаў, якія таксама могуць выканаць і яны злосна ўхіляюцца і да некаторай ступені яны вядуць агітацыю сярод беднякоў супроць выкананьня збожжазагатовак, гэта будзь агенты кулака і яго лепшыя памочнікі».

Ці можна што-небудзь зразумець з гэтага артыкулу? Дзе кіраўніцтва вынной рэдакцыі?

Застаецца дадаць, што рэдактарам гэтай насьценгазэты зьяўляецца сакратар камсамольскай ячэйкі Кагановіч, які сам фактычна зрывае збожжазагатоўкі. Камсамольская ячэйка складаецца з 35-ці чалавек, усе яны ня прымаюць актыўнага ўдзелу ў загатоўках. Камсамольцы Бочка і Лаханка самі ня выканалі абавязацельстваў па здачы збожжа.

Г. Д.

Выкрылі кулацкі таемнік

У калгасе імя Карла Маркса, Дабрасьнеўшчынскага сельсавету, Магілёўскага раёну, пралезьлі кулацкія элементы. Актыў вёскі Дабрасьнеўчы выявіў захаванае кулацкае збожжа ў калгаснікаў Катрانковых Якуба і Міхася. Гэтыя два кулацкія агенты — мясныя сярадзякі — пралезьлі ў калгас выключна са шкурніцкімі мэтамі, каб ухіліцца ад індывідуальнага абкладаньня; яны трымалі цесную сувязь з кулакамі і хавалі іх збожжа і інш. маемасьць. Як бачыце, хоць скура новая, але нутро засталося старым.

Актыў калгасу імя Карла Маркса, давядзіўшыся аб тым, што Катрانковы хавалі кулацкае збожжа, пастанавіў братоў Катрانковых з калгасу выключыць і аддаць пад суд. Пры вобыску ў іх знойдзена 60 пудоў мукі, 25 пуд. шпаніцы, 100 пуд. жыта, 1.000 пуд. бульбы, 15 пуд. солі, шмат вопраткі, абутку і срэбра. Каб вывезьці збожжа, прышлося запрэгчы 6 коней.

Апрача таго, брыгада высьветліла, што Катрانковы купілі з мотай спэкуляцыі лён і ільняное семя. Гэтыя кулацкія агенты вечна шылі, што «ў калгасе няма збожжа, што нельга здаваць збожжа, таму што самім есьці няма чаго».

Треба дадаць, што за апошнія часы пасьля разгорнутага пастановы партыі аб збожжазагатоўках і павышэньні ўраджайнасьці ў калгасы Дабрасьнеўшчынскага сельсавету ўступілі 32 гаспадаркі.

Парфіяновіч.

Кулацкія агенты з партбілетамі ў кішэні

ПОЛЫЦАК.

Збожжазагатоўкі па раёне праходзяць незадавальняюча. На 15 сьнежня плян выкананы усяго на 61,7 проц. Цьвёрдыя заданьні з кулацка-заможных гаспадарак спагнаны на 59 проц.

Адставаньне тлумачыцца тым, што пасобныя члены партыі згубілі клясавую пільнасьць, патураюць кулацкаму сабатажу збожжазагатовак. У Бабынінскім сельсавеце члены партыі Кусенка, Бедзян, камсамольцы Бірукоў, Блюхер, Анісаў прымацаваны да пасобных вучасткаў, але толькі фармальна, на паперы. На справе-ж яны нават не наведваюць сваіх вучасткаў, а калі запытаешся ў іх аб становішчы збожжазагатовак, адказваюць: «Нічога, справа ідзе добра». Гэта простае ашуканства застаецца непакараным.

Сакратар-партыйнік, ён-жа старшыня калгасу «Чырвоная Горка» сам ня выконвае заданьня па здачы збожжа і крычыць аб перэальнасьці пляну.

Старшыня калгасу «Каміндэрн», Гарадоцкага сельсавету, член партыі Саўчанка выкідвае «аб'ектыўныя прычыны» для апраўданьня зрыву загатовак. Ён спасылаецца заўсёды на дрэнную дарогу, зусім забываючыся, што гэта не павінна быць тормазам у здачы збожжа.

У Арлюйскім сельсавеце член партыі Абалок Сяйбі стаў на шлях адкрытага зрыву пітства партыі. Едучы з горацу, Абалок спатакаў фурманкі калгаснікаў, якія везьлі здаваць 14 цэнтн. збожжа. Абалок вярнуў калгаснікаў назад, заявіўшы: «Здаваць збожжа ня трэба, я дагаварыўся ў РВК».

У Гарадоцкім сельсавеце кулацкі сабатаж загатовак узначальваў старшыня сельсавету «калгуніст» Путачоў, які ўдаўся зьнят з работы і аддадзены пад суд.

У в. Каменка, Вярчэчынскага сельсавету, кулацкі агент Жуноў С., пралезьлы ў камісію сацыяльнасьці, самавольна зьмешчыў вёрдыя заданьні кулаком Жуневу Е., Парасюгаву І. і інш., а бедняком Зуеву М., Куцілінаву З. даў павялічаныя заданьні.

Усе ўказаныя факты сьведчаць аб слабай барацьбе з кулацкім сабатажам збожжазагатовак у радзе сельсаветаў. Полаччыны. РК КП(б)Б ужо вынуў з радоў партыі часку «партыйцаў», якія размазьнілі і зрасьлі з кулацтвам, вялі сумесную работу з клясавым ворагам па зрыву загатовак. Треба тэрмінова ачысьціць партыйныя ячэйкі гэтых сельсаветаў ад чужых элементаў. Гэта забясьпечыць поўнае выкананьне пляну загатовак.

(БЕЛТА).

Лепельскі леспрамгас мяняе жалеза на жыта

ЛЕПЕЛЬ. Лепельскі раён — адзін з адстаючых па збожжазагатоўках. На 15 сьнежня гадавы плян выкананы на 46,6 проц. У той-жа час у раёне назіраюцца факты спэкуляцыі збожжам, абмену яго на розныя прамтавары і г. д.

Дырэктар Лепельскага леспрамгасу тав. Зрэлін даў цьвёрдую дырэктыву сваім прарабам аб закупцы збожжа ў калгасах, калгаснікаў і аднаасобнікаў шляхам абмену на яровы, жалеза і інш.

У выкананьне гэтай дырэктывы прарабы закупілі на працягу першай дэкады сьнежня 10 тон збожжа. Гэтыя зьявы праведзены паступным чынам: у калгасах «Чырвоная Жэмчына», «Валасовічы» і «Перамога» — мянялі тону жыта на тону жалеза.

Треба ўдарыць па спэкулянтах збожжам, па парушальніках пастановы ЦК і СНК СССР аб забароне гандлю збожжам да поўнага выкананьня дзяржаўнага пляну загатовак.

Р-т.

Сабатажнікі загатовак атрымалі па заслугах

Разглядаючы матар'ял ходу загатовак збожжавых культур, бульбы і інш. гаспадарча-палітычных кампаній па Нараўлянскім, Лоеўскім, Чырвонапольскім і Чачэрскім раёнах, прэзыдыум і партколегія ЦККК КП(б)Б канстатуюць адставаньне і адсутнасьць рашучага пералому па гэтых раёнах у выкананьні загатовак, аб чым сьведчаць сярэднія лічбы выкананьня на 10 сьнежня: па Нараўлянскім раёне па збожжы —47 проц., па бульбе—62,5 проц., Лоеўскім—43 проц. і 43,1 проц., Чырвонапольскім—35,9 проц. і 45,6 проц., Чачэрскім —44 проц. і 42,6 проц. Прычыны разгледжаныя лічбы выкананьня збожжазагатовак па сэктарах паказваюць поўнае аслабленьне ў гэтых раёнах нацэску на кулацка-заможныя элементы, што відаць з наступнага: па Лоеўскім раёне з 67 тон цьвёрдага заданьня, унесена толькі 1 тона; па Нараўлянскім з 43 — 3 тоны; па Чырвонапольскім з 10 тон — 1 тона; па Чачэрскім з 54 тон—23 тоны.

Гэтыя-ж раёны ганебна і сыстэматычна адстаюць і па іншых відах загатовак і выкананьні фінансавага пляну.

Партыйнае і савецкае кіраўніцтва гэтых раёнаў ня раз былі папярэджаны Цэнтральным Камітэтам партыі, у прыватнасьці, апошнім пленумам ЦК КП(б)Б, дзе спэцыяльна абмяркоўвалася пытаньне аб загатоўках і ня глядзячы на гэта, кіраўніцтва гэтых раёнаў не зрабіла належнага пералому ў справе загатовак, не павяло рашучай барацьбы з кулацтвам і яго агентурай—правым апартунізмам.

На аснове гэтага прэзыдыум і партколегія ЦККК пастанаўляюць:

1. Сакратар нараўлянскага РК партыі т. Балцін, старшыня РВК т. Кірсак і старшыня РАЙКК т. Бунякоў за невыкананьне дырэктыў ЦК партыі і непрыняцьце неабходных мер для стварэньня рашучага пералому ў ходзе загатовак па раёну, за праяўленьне прыміротчых адносін да кулацка-заможных элементаў і праяўленьне апартуністычнага самацёку ў рабоце — павінны быць выключаны з партыі, але, прымаючы пад увагу шчырае прызнаньне імі сваіх памылак і абяцаньне ў далейшым выправіць іх па практычнай рабоце — абмежацца строгай вымовай з папярэджаньнем.

2. Сакратара лоеўскага РК партыі тав. Бедрыцкага В. В. (зьнятага бюро ЦК партыі з работы)—члена партыі з 1927 г. і старшыню РВК т. Шамецька І. Ф.—члена партыі з 1926 г., які не раз прыцягваўся да суровай адказнасьці за п'янства і скажэньне клясавай лініі (у 1929 г. у часе ге нэральнай чысткі партыі атрымаў строгую вымову з папярэджаньнем)—за невыкананьне дырэктыў ЦК партыі па пытаньнях загатовак і правал у раёне іншых сельскагаспадарчых палітычных кампаній, за праяўленьне апартуністычнага самацёку ў рабоце і патураньне заможна-кулацкім элементам—з партыі выключыць.

3. Старшыні лоеўскай РК-РСІ т. Федарэнку Н. І.—члена партыі з 1925 г. за перабачаньне ва фактах апартуністычнага скажэньня лініі партыі ў раёне, адсутнасьць сыгналізацыі аб гэтым перад ЦККК, прымаючы пад увагу, што ён вылучан і працуе старшынёю Кантрольнай Камісіі толькі трэці месяц, абмежавацца вынясьненьнем яму строгай вымовы. Папярэдзіць тав. Федарэнку, што ў выпадку, калі ён будзе створан пералом у рабоце ў бліжэйшы час, ён будзе прыцягнут да яшчэ больш суровай партыйнай адказнасьці.

4. Сакратара чырвонапольскага райкому партыі т. Шатуна І. Р.—члена партыі з 1919 г., старшыню РВК т. Грынкевіча В. І. —члена партыі з—1920 г. і старшыню РАЙКК т. Балбатуна Ю. А.—члена партыі з 1918 г. за праяўленьне праваапартуністычнага самацёку ў справе загатовак і правядзеньня гаспадарча-палітычных кампаній у раёне, слабы націск і нават патураньне кулацка-заможным элементам, якія злосна ня выконваюць заданьня па загатоўках — з партыі выключыць.

5. Старшыню чачэрскага РВК т. Чэшко І. А.—члена партыі з 1920 г. за скажэньне клясавай лініі ў правядзеньні загатовак (слабы націск на заможна-кулацкія элементы), незабясьпечаньне выкананьня дырэктыў партыі і непрыняцьце рашучых мер для стварэньня пералому ў ходзе загатовак па раёну—з партыі выключыць.

Жыракоў выключан з партыі

Пастанова партколегіі ЦКК КП(б)Б ад 15-XII-1932 г.

Жыракоў Н. П. — член КП(б)Б з 1918 г., п/білет № 0210188, год нараджэньня 1896, расіец, рабочы, у Чырвонай армії служыў з 1918 па 1925 г., у 1928 г. быў на курсах партактыву, у 1931 г. быў пасланы на курсы чырвонай прафэсуры; у сьнежні 1931 г. пасланы ЦК КП(б)Б на работу сакратара Жлобінскага РК КП(б)Б, дзе прабыў да ўзьвікненьня гэтай справы. Пленум ЦК КП(б)Б ад 1/XII—32 г. сьняў т. Жыракова з работы сакратара Жлобінскага РК КП(б)Б, вывеў са складу членаў пленуму ЦК і даручыў ЦККК КП(б)Б вырашыць пытаньне аб яго партыйнасьці.

Жыракоў абвінавачваецца ў тым, што будучы сакратаром РК КП(б)Б ведаў, што Міхайлоўскія — сваякі па жонцы — сьяўляюцца былымі арандатарамі зямельных вучасткаў, буйнымі мясагандлярамі, клясава-чужымі элементамі, пазбаўленымі выборчых правоў і ня толькі ня прыняў мер да выключэньня Міхайлоўскіх з калгасу, як разлагаючых яго, а наадварот, пад уплывам сваякіх сувязей стаў на абарону іх, трацячы тым самым клясавае пачуцьцё члена партыі. Як сакратар РК КП(б)Б і член прэзыдыуму РВК, ён сапраўднічаў адналенньню іх у выборчых правах, даўшы ім водзыў, як ворагам. Тым самым ён, як кіраўнік партарганізацыі спрыяў аслабленьню ў пільнасьці партарганізацыі ў барацьбе з кулацкім клясава-варожым элементам.

Партколегія ЦКК пастанаўляе: Жыракова Н. П. з партыі выключыць.

Сакратар ПК ЦКК КП(б)Б

ДАМБРОЎСКІ.

Пастанова парттройкі МенгарКК КП(б)Б ад 17-XII-32 г. па справе Карпіловіча

Карпіловіч Сьцяпан Мікалаеў, 1908 г. нараджэньня, беларус, па сацстановішчы селянін, кандыдат партыі з студзеня 1932 году, у іншых партыях не знаходзіўся, у Чырвонай армії ня служыў, працуе старшынёю калгасу «Чырвоны».

Абвінавачваецца ў тым, што як кандыдат партыі, член сельсавету і старшыня калгасу, будучы прымацаваным партячэйкай і сельсаветам да в. Шчытомірычы для правядзеньня там своячасовага і поўнага выкананьня пляну загатовак збожжа і бульбы, ня толькі ня выканаў даручанага яму заданьня, а стаў на шлях яўнага падтрыманьня кулацкага сабатажу гэтай вёскі, выступіўшы на пленуме сельсавету з кулацкімі настроямі аб тым, што вёска Шчытомірычы ня мае магчымасьці выканаць загатоўкі.

Тав. Карпіловіча — за бязьдзейнасьць у справе загатовак, за выступленьне на пленуме сельсавету з падтрыманьнем кулацкага сабатажу ў вёсцы Шчытомірычы выключыць з кандыдатаў партыі і зьняць з работы старшыні калгасу.

Старшыня МенгарКК КП(б)Б

ЖОЛУДАЎ.

15 тысяч тон мяса—і ні на адну тону менш!

Выкананьне гэтай баявой праграмы мясазагатовак чацьвёртага кварталу — важнейшая задача партарганізацый

Вучыцца ў перадавых сельсаветаў

ЛЕЛЬЧЫЦЫ. На 15 сьнежня плян мясазагатовак 4-га кварталу па раёну выкананы на 78 проц.

Некаторыя сельсаветы паказалі сапраўды ўзорны прыклад барацьбы за датэрміновае выкананьне пляну мясазагатовак. Лельчыцкі сельсавет выканаў свой плян на 131 проц., Сімашкі — на 124 проц., Карпінкі — на 115 проц. і Глушавіцкі — на 120 проц.

Партячэйкі і загатоўчыя арганізацыі гэтых сельсаветаў шырока пачулі заклікі сярод калгаснікаў і працоўных аднаасобнікаў пастанову ЦК і СНК аб мясазагатоўках. Пляны былі даведзены да кожнай вёскі.

Члены сельсавету, асабліва Лельчыцкага і Самашкага, узялі на сябе абавязак датэрміновага перавыкананьня пляну. Гэта абавязацельства яны з гонарам выканалі.

Аднак, ёсьць такія сельсаветы, якія з кварталу ў квартал ня выконваюць пляну. Напрыклад. Астражыцкі сельсавет яшчэ нічога ня здаў, Стадолішкі — 6 проц., Баравускі —20 проц. і інш.

Кіраўнікі Астражыцкага сельсавету недаацэньваюць гэтай важнейшай кампаніі і разважаюць прыблізна так: «ня выкавае плян у чацьвертым квартале, дык ужо разам здамо ў першым квартале 1933 году».

Гэтыя апартуністычныя размовы не атрымалі рашучага адпору з боку партячэйкі і раённых арганізацый.

Лельчыцкі раён мае ўсе магчымасьці для датэрміновага выкананьня пляну мясазагатовак 4-га кварталу. Гэта выразна пацьвярджае работа перадавых сельсаветаў.

Калектыўны карэспандэнт газэты «КАЛГАСЬНІК НА ВАРЦЕ».

Ня здана ні аднаго кілёграму

РАГАЧОЎ. Вёска Бакшыцы, Асяраванскага сельсавету, да гэтага часу яшчэ ня здала ні аднаго кілёграму мяса.

Член сельсавету па гэтай вёсцы Шуткоў Емельян ня толькі не ведае ніякай работы па мясазагатоўках, а наадварот сам яшчэ ня выканаў свайго пляну, а разбазарвае сваё мяса на рынку.

Яго трымаў пасьлядоўны цьвёрдазаданьнік Палякоў Сьцяпан, які таксама яшчэ нічога на здаў і прадаў на базары 2-гадовую парсючку.

Фактаў разбазарваньня мяса і ўхіленьня ад выкананьня абавязацельстваў па гэтай вёсцы ёсьць шмат.

Аб усім гэтым ведае сельсавет, але ніякіх мер ня прымае.

К.

Менш чым на палову

ШКЛОЎ. Шклоўскі раён павінен загатовіць у 4-м квартале 7.330 цэнтн. мяса. Тэмпы загатовак на сёньняшні дзень ніяк не забясьпечаць своячасовага выкананьня пляну. Плян выкананы менш чым на палову.

Некаторыя сельсаветы, як Гарадзецкі і Кожэнніцкі, яшчэ нават не давялі плян да двароў.

У Гарадзішчанскім сельсавеце выкананьне пляну мясазагатовак ідзе самацёкам. Квартальны плян па сельсавету выкананы на 14 проц.

У Арлюйскім сельсавеце ніякай масавай работы вакол пастановы ЦК і СНК не вядзецца. Плян выкананы на 4,5 проц.

У апарат Загатзьнёлы пралезьлі чужыя элементы, якія сыстэматычна абязважваюць калгаснікаў і аднаасобнікаў, здаючых мяса.

Вось характэрныя факты: у калгасьніка Ладуцешка Я. баран важыў на калгасных вагах 25 кілёграм. Пры прыёмцы на загатоўкі ён ужо важыў ня больш 17 кілёграм. Пасьля доўгіх спрэчак прыёмшчык згадзіўся запісаць сапраўдную вагу.

Замест 6 зданых калгаснікам Угловым Фёдарам курэй, у кнігах запісалі чатыры.

Вінаватыя ў гэтых злачынствах павінны быць прыцягнуты да суровай адказнасьці.

П. К.

Да 1 студзеня выканаць 80 проц. ільназагатовак

ПАСТАЯННАЯ ВЫТВОРЧАЯ БРЫГАДА ВЫРАШАЕ ПОСЬПЕХ ІЛЬНАЗАГАТОВАК

Правільная арганізацыя працы унутры брыгады забясьпечыла перамогу калгасам Карніцкага сельсавету, Лёзьнянскага раёну

ПЕРАДАВІКІ ІЛЬНАЗАГАТОВАК

ЛЁЗНА. (Наш кар.). Пасталная вытворчая брыгада ў калгасе, якая раней сеяла, уборала, а зараз пераапрацоўвае лён, адгрывае рашаючае значэньне ў выкананьні пляну ільназагатовак. Гэта пацьвярджае практыка перадавых калгасаў Карніцкага сельсавету, Лёзьнянскага раёну: «Бальшавік», «Прамэтэй», «Новы быт», «Расьсьвет» «Іскра», «Уперад», «На варце» і інш. Гэтыя калгасы поўнасьцю ўжо закончылі пераапрацоўку і здачу ільнавалакна дзяржаве.

Для прыкладу возьмем калгас «Бальшавік». У гэтым годзе калгас засеяў 82 га ільну, які быў своячасова ўбраны і ўзьняты са сьцеліўча. З 98 працаздольных па пераапрацоўцы ільну было занята 42. Для работы на мяльна-сушыльным пункце былі створаны дзве ўдарныя брыгады і выначаны адказныя за ход пераапрацоўкі ільну. З сушыльняў траста пазвонілася да пуні, дзе была ўстаноўлена пасьлякарвальная ільнамялка, якая прыводзілася ў рух коньмі або трактарам. Тут жа лён мяўся брыгадай мужчын у 6 чал. Пасьля гэтага брыгада ў 18 жанчын атрэпала сьцёрты лён. Вытворчая брыгада апрацоўвала адну тону ільнатрасты ў дзень.

Норма выпрацоўкі—для брыгады мужчын у 6 чал. зьмяць адну тону трасты, а для жанчын натрапаць 28—29 фунтаў ільнавалакна ежнай — сыстэматычна выконвалася. Якасьць апрацаванага валакна — 8-9 гатунку.

Лепшыя ўдарнікі і ўдарніцы — Ціханенка, Наканьковы Ульяна і Марфа, камсамольцы — Аўсеенка, Прарэўскі і Кукальнін перавыконвалі нормы.

За добрую ільнапрадукцыю калгас атрымаў 2.503 кгр. збожжа і прамтавары. Калгас яшчэ прэміраваны сельска-гаспадарчай машынай і 60 рублямі.

На прыкладзе калгасу «Бальшавік» мы бачым, якое значэньне мае пасталная вытворчая брыгада для своячасовага скончаньня пераапрацоўкі ільну і здачы ільнавалакна дзяржаве.

Практыку калгасаў Карніцкага і Калышанскага сельсветаў—перадавікоў у барацьбе за лён— треба неадкладна перанесьці ў усе іншыя раёны.

Кулацкія агенты разбазарваюць прамтавары

ГАРАДОК. (Наш кар.). У пляне ільназагатовак Гарадоцкі раён займае вялікае месца. 1.570 тон ільнавалакна павінны здаць дзяржаве калгасьнікі і аднаасобнікі Гарадоцкічыны. Прычым 80 проц. ільнапрадукцыі трэба здаць да 1 студзеня.

На справе-ж Гарадоцкічына па ільнаводнай групе зьяўляецца самым адстаючым раёнам. На 15 сьнежня гадавы плян выкананы па раёну на 18,8 проц. Прырост за пяцідзёнку дасягае ня больш 2—3 проц.

Адной з прычын такога маруднага ходу загатовак зьяўляецца тое, што ў некаторыя калгасы раёну пралезьлі кулакі і іх агенты, якія зрываюць загатоўкі.

Возьмем Паташанскі сельсавет. Ні адзін з калгасаў гэтага сельсавету не прыступіў да здачы ільну дзяржаве. Для стымуляваньня ільназагатовак урадам адпушчаны збожжа і прамтавары. Атрымалі прэміі і калгасы гэтага сельсавету, а да апрацоўкі ільну ўсё-ж не прыступілі.

Прыкладам можа служыць калгас «Чырвоны сьцяг». У гэтым калгасе прэміі за лён, атрыманыя авансам, праўленьне, на чале з замоўнікам Буйновым, разьмеркавала сярод сваякоў.

У калгасе «Бальшаўіцкая вясна», Болецкага сельсавету, пачалі разьмяркоўваць лён, а дзяржаве не здалі ні адзінага кілё. Ініцыятарам гэтай кулацкай дзяльбы зьяўляецца само праўленьне. У калгасе «Чырвоны Перакоп», Пальчыцкага сельсавету лён яшчэ знаходзіцца на сьцеліўчы.

Партарганізацыя Гарадоцкічыны павінна ў бліжэйшыя-ж дні панесьці руйнуючы ўдар кулакам і іх агентам, якім ўсімі спробамі імкнуцца сарваць ільназагатоўкі.

Клясавы вораг на вушацкім ільназаводзе

ВУШАЧЫ. (Наш кар.). Тэмпы ільназагатовак па Вушацкім раёне за апошнія пяцідзёнкі зусім нездавальняючыя. Другая пяцідзёнка сьнежня дала ўсяго толькі 4 проц. прыросту. Зразумела, што пры такіх тэмпах Вушацкі раён ня выканае дырэктывы партыі і ўраду аб здачы да 1 студзеня 80 проц. ільнавалакна.

Адной з прычын такога становішча ільназагатовак у рабоце зьяўляецца тое, што загатоўчыя арганізацыі, у прыватнасьці вушацкі ільназавод, ня сталі арганізатарамі загатовак. Вось факты:

Кожны дзень на ільназавод прыбываюць сотні фурманак з ільнатрастой. Кантора-ж ільназаводу не забясьпечыла своячасовы прыём трасты ад калгасаў. Фурманкі з ільнатрастой сутакі стаяць у чарзе і чакаюць прыёмкі. Для прыёмкі вылучан толькі адзін—два чалавекі.

Пядаўна па віне прыёмшчыкаў на заводзе засталося начаваць з ільнатрастой 30 фурманак, якія прыехалі за 35 кілёмэтраў і ўвесь дзень чакалі прыёмкі. Ночку пайшоў дождж, траста змокла і часткова пасвавалася. Прыёмшчыкі адмовіліся прыняць трасту і адправілі калгаснікаў назад.

Такія ганебныя факты выклікаюць абурэньне сярод калгаснікаў і кладуць па-руку кулакам і іх агентам, якія атакуюць за зрыў ільназагатовак. Усё гэта адбываецца на вачох дырэкцыі і тэхнічна-адміністрацыйнага персаналу ільназаводу, якія зусім не рэагуюць на гэтыя факты.

Мы патрабуем ад пракуратуры рэспублікі бязадкладнага прыцягненьня да судовай адказнасьці вінаватых у псаваньні трасты і ў дэзарганізацыі прыёмкі ільнатрасты на вушацкім ільназаводзе.

Да судовай адказнасьці за раскрадваньне ільнатрасты

СЯННО. (Наш кар.). У рэйсе калгасаў раёну праўленьні не зьвяртаюць увагі па захову ільнатрасты і валакна. Напрыклад, у калгасе «Берашева», Хадашанскага сельсавету, ільнатраста раскідана ў некалькі мясцох і не захоўваецца. За апошнія дні частка трасты расьцягнута невядома кім. Праўленьне ня прымае ніякіх мер, каб захаваць трасту і своячасова здаць яе на завод.

У калгасе «Цэпішчы», Расьлянскага сельсавету, у часе пераапрацоўкі ільнатрасты частка ільнавалакна была раскрадзена. Па месцы злачынства былі затрыманы калгаснікі Шафранская, Лукашова і Новікава. Тут-жа быў складзен акт і перадаваны ў райміліцыю. Але затгуль ніякіх мер да злачынцаў ня ўжыта.

Линейная калибровочная мишень LRT-BE4-V2

Аб загатоўках масла, малака і сыру

Пастанова Савету Народных Камісараў і Цэнтральнага Камітэту ЎсеКП(б)

Савет Народных Камісараў Саюзу ССР і Цэнтральны Камітэт УсеКП(б) пастанаўляюць:

1. Зацьвердзіць плян здачы малака саўгасамі на 1933 год у колькасьці 30.700 тон (у перавод на масла) супроць зданых імі ў 1932 годзе 22.000 тон.

З іх:

Саўгасы Наркамсаўгасаў	— 24.975 тон,
саўгасы Наркамзему	— 1.505 тон,
саўгасы Наркамснабу	— 3.940 тон,
іншыя саўгасы	— 280 тон.

2. Скасаваць існуючую дагаворную (кантрактацыйную) сыстему загатовак малака, масла і сыру і ўстанавіць у парадку падатку для ўсіх адзіаасобных гаспадарак і калгасных двароў, якія маюць кароў, абавязковую пастаўку (здачу) малака дзяржаве па ўстаноўленых дзяржаўных цэнах.

3. Зацьвердзіць на 1933 год наступныя нормы здачы малака асобна для адзіаасобных сялянскіх гаспадарак, асобна для калгасных двароў у калгасах, якія маюць малочна-таварныя фэрмы і асобна для калгасных двароў у калгасах, якія не маюць малочна-таварных фэрм (у літрах на 1 карову ў год).

РАЁНЫ	Для адзіаасобных сялянскіх гаспадарак	Для калгасьнікаў у калгасах, якія маюць МТФ	Для калгасьнікаў у калгасах, якія маюць МТФ
I-я ГРУПА. Паўночны край, Заходняя Сібір, Уральская вобласьць, Іванаўская вобласьць	280	220	180
II-я ГРУПА. Ленінградская вобласьць, Маскоўская вобласьць, Західняя вобласьць, Паўночна-Каўказкі край, Башкірская АССР, Татарская АССР	20	180	150
III-я ГРУПА. ЦЧВ, УССР, Горкаўскі край, Сярэдняя Волга, Нізкая Волга, Казакстан, Усходня-Сібірскі край, БССР, Далёка-Ўсходні край	170	110	80
IV-я ГРУПА. Крым, Карэлія, Горныя раёны Паўночнага Каўказу, Закаўказьце, Калмыкія, Кіргізія, Сярэдняя Азія, Якуція — за выключэньнем качавых раёнаў	120	75	50

4. Устанавіць наступныя календарныя тэрміны выкананьня гадавога пляну здачы малака аднаасобнікамі і калгасьнікамі ў процантах ад гадавых норм, указаных у п. 3 гэтай пастановы.

	I квартал	II квартал	III квартал	IV квартал
Паўночны край	15	45	30	10
Ленінр. вобл. і Карэлія	20	40	25	15
Заходняя вобл.	20	40	25	15
Маскоўская вобл.	20	40	25	15
Іванаўская вобл.	20	40	25	15
Горкаўскі край (Н.-гар.)	20	40	25	15
Уральская вобл.	15	35	40	10
Башкірская АССР	10	30	45	15
Татарская АССР	10	35	40	15
Сярэдн.-Волскі край	15	35	35	15
ЦЧВ	10	40	35	15
Паўночны Каўказ	15	35	35	15
Нізкн.-Волскі край	15	40	35	10
Дагестан	15	25	40	20
Крым	15	40	35	15
Казакстан	10	40	40	10
Кіргізія	10	35	40	15
Зах.-Сібірскі край	15	35	40	10
Усх.-Сібірскі край	15	35	40	10
Далёка-Ўсходні край	10	25	45	20
УССР	15	40	35	10
ЗОФСР	20	40	25	15
БССР	15	35	40	10

5. Устанавіць для малочна-таварных фэрм і для аграмаднага стада калгасаў пазасобны плян здачы малака дзяржаве па наступных нормах на 1933 год (у літрах з кароўы ў год).

РАЁНЫ	МТФ і аграмадн. стада калгасаў
I-я ГРУПА. Паўночны край, Заходняя Сібір, Уральская вобласьць, Іванаўская вобласьць, Паўночны Каўказ	580
2-я ГРУПА. Ленінградская вобласьць, Маскоўская вобласьць, Західняя вобласьць, Башкірская АССР, Татарская АССР	520
3-я ГРУПА. ЦЧВ, УССР, Горкаўскі край, Сярэдняя Волга, Нізкая Волга, Казакстан, Усходня-Сібірскі край, БССР, Далёка-Ўсходні край	470
4-я ГРУПА. Крым, Карэлія, Горныя раёны Паўночнага Каўказу, Закаўказьце, Калмыкія, Кіргізія, Сярэдняя Азія, Якуція	350

6. Прапанаваць СНК рэспублік, краявым і абласным выканкомам, крайкомам, абкомам і ЦК нацкампартый у адпаведнасьці з п. 1 і 5, не пазьней 25 сьнежня 1932 г. устанавіць і апублікаваць параённыя нормы здачы, дапускаючы па асобных раёнах некаторыя хістаньні вышэй ці ніжэй нормы, устаноўленай для данай рэспублікі, краю, вобласьці, аднак з тым, каб выкананьне ўстаноўленых плянаў па рэспубліках, краёх і абласьцях было-б забясьпечана поўнасьцю.

7. Абавязаць сельсаветы, пад адказнасьць СНК саюзных рэспублік, край- (абл.) выканкомаў не пазьней 10 студзеня ўручыць кожнаму аднаасобніку і калгасьніку, які мае карову, абавязацельства па здачы малака з указаньнем пункту здачы і з разьбіўкаю гадавой нормы здачы на месяцах у адпаведнасьці з устаноўленымі для раёнаў квартальнымі плянамі загатовак. Абавязаць сельсаветы весьці ўлік выкананьня здачыкамі сваіх абавязацельстваў.

8. Гадавы, квартальны і месячны плян здачы малака дзяржаве МТФ і калгасамі з аграмаднымі жывёлы зацьвярджаюцца край-(абл.) выканкомамі, саўнаркомамі рэспублік па раёнах. Разьбіўка зацьверджаных для раёну плянаў здачы па асобных калгасах робіцца райвыканкомам.

9. Тыя, што ўхіляюцца ад выкананьня абавязацельстваў па здачы малака ці масла дзяржаве па патрабаваньні загатоўчых арганізацый, падлягаюць праз сельсаветы грашоваму штрафу ў разьмеры рынкавага кошту невыкананай часткі абавязацельства, прычым недавыкананая частка абавязацельстваў падлягае спагнаньню ў абавязковым парадку ў наступным месяцы звыш нормы здачы гэтага месяца.

10. У раёнах, дзе адсутнічаюць масларобча-сыраварныя заводы, за выключэньнем пэльна-малочных раёнаў, выкананьне абавязацельстваў аднаасобнікамі, калгасьнікамі і калгасамі робіцца топленым маслам з разьліку 1 кгр. масла па 25 літраў малака.

11. Абавязаць масларобны варочаць заат чыкам малака адкіды ад перапрацоўкі малака на масла ў кольасьці: МТФ і калгасам з аграмаднымі стадам — 50 проц. якасьці здаванага малака; іншым гаспадаркам — 35 проц. ад вагі здаванага малака.

12. Загатоўку малака і масла ў порадку гэтай пастановы ўскласьці на Наркамсаўгас СССР і Цэнтрасаюз, якія арганізуюць прыёмку малака і масла ад здачыкаў: першы — праз масларобча-сыраварныя, кансэрвовыя заводы, а цэльнае малако — праз прыёмныя пункты Саюзмалака; другі — праз сельспажыўтаварыствы.

13. Абавязаць дырэктароў масларобчых, сыраварных і кансэрвовых заводаў, а таксама старшынь сельспажыўтаварыстваў прыцягваць да прымусовай адказнасьці асоб за спробы здаваць зьнятае і фальсыфікаванае (з прымесямі) малако ў лік выкананьня абавязацельстваў, устаноўленых гэтай пастановай.

14. Загатоўку малака ў пэльна-малочных раёнах прымаюць праз трусты «Саюзмалака» Наркамсаўгас СССР, а таксама праз спажывецкую кааперацыю. Сыце цэльнамолочных [illegible] і іх рэалізацыяй [illegible] Наркамсаўгас СССР сумесна з Цэнтрасаюзам.

15. Устанавіць з 1 студзеня 1933 г. загатоўчыя цэны на малако, якое здаецца на масла-сыраводы калгасам, калгасьнікам і аднаасобнікам, у разьмеры 15 кап. за літар.

16. Забараніць мясцовым органам улады, а таксама загатоўчым органам накладаць на калгасьнікаў, аднаасобнікаў і МТФ абавязацельствы па здачы малака ў разьмерах, перавышаючых апублікаваныя на асновe гэтай пастановы параённыя нормы здачы, пакідаючы ўсе лішкі малака пры акуратным выкананьні плану здачы малака ў распараджэньне самих гаспадарак як для продажу, так і для асабістага спажываньня.

17. Даручыць Наркамснабу СССР у 5-дзённы тэрмін пераглянуць на зацьвярджэньне Саўнаркому СССР інструкцыю па прыстасаваньні гэтай пастановы.

Старшыня Савету Народных Камісараў Саюзу ССР
В. МОЛАТАЎ (СКРЫБІН).
Сакратар ЦК УсеКП(б)
І. СТАЛІН.
19 сьнежня 1932 г.

Юбілей Якуба Коласа

ПАД СЬЦЯГАМ КАМУНІЗМУ

Прамова прэзыдэнта Беларускай Акадэміі Навук тав. Горына

На юбілеях звычайна прынята гаварыць прыемныя рэчы. Але я думаю ніхто з прысутных на можа супярэчыць, што тав. Я. Колас сапраўды БУЙНАЯ КАЛЁРЫТНАЯ ФІГУРА Ў БЕЛАРУСКАЙ ЛІТАРАТУРЫ, адзін з не зацяжэльнікаў, вялікі майстар мастацкіх, пірычных і эпічных твораў. Мне думаецца, што Я. Колас і Я. Купала ў стварэньні літаратурнага стылю нашай беларускай літаратуры займаюць такое-ж месца, як у рускай Пушкін, Лермантаў, Гогаль. Зараз асабліва відаць, як мала меў рацыі Максім Багдановіч, які ў «нашаніўсіх» агляндах недаацэньваў Я. Коласа, лічачы яго толькі беларускім Ніціцшым.

У свайм выступленьні я хацеў-бы спыніцца толькі на адным пытаньні: што-ж дало такую сілу Я. Коласу, якая падняла яго на вершыню нашай беларускай літаратуры? Мне здаецца, сіла Я. Коласа ў тым, што ён, як губка ўсмактаў у сябе думы і пакуты нашага ва ўмовах семаўладзтва прыбітага, разбуранага нацыянальна-прыгнечанага селяніна, які толькі пры дыктатуры пралетарыяту адчуў радасьць жыцьця.

Сапраўды, калі гістарычна прасачыць творчасьць Якуба Коласа, дык у ёй, як у люстры, знайшлі адбітак горкія думы нашага бядняка і серэдняка, прыгнечаных абшарнікамі і буржуазіяй. З малаком маткі Я. Колас увабраў у сябе нянавісьць да самаўладзтва і памешчыкаў. Весь што, напрыклад, Я. Колас пісаў некалькі гадоў таму назад у сваёй аўтабіяграфіі: «З самае ранняга дзяцінства закрадалася ў душу варожае пачуцьцё да паноў, а з часам яно яшчэ больш узмацнілася».

Гэта нянавісьць да памешчыкаў сапраўды знаходзіць свой адбітак у ранейшых работах Я. Коласа. Вазьмем, напрыклад, надрукаваны ў 1906 годзе яго першы верш «Наш родны край». Чытаючы яго, адчуваеш, што паэт гаворыць словамі прыбітага і прыгнечанага беларускага селяніна. Тыя-ж матывы вострае выяўлены і ў творах «Жніво», «Вёска» і інш.

Я ня зьбіраюся гістарычна прасьледаць творчасьць Коласа. Відома, што на пэўных этапах глыбокія хістаньні западалі ў душу паэта, але як прадстаўнік тых сацыяльных пластоў, з якіх ён вышаў, Колас знаходзіў у сябе сілу перамагаць іх, каб разам з пралетарыятам весьці барацьбу за сацыялізм.

Кастрычніцкая рэвалюцыя невыпадкова правяла вострую грань у творчых матывах паэта. Сэнс яго творчасьці ўжо другі. Дыктатура пралетарыяту, якая забясьпечыла працоўнаму сялянству зьнішчэньне памешчыцкай кабалы і нацыянальнага прыгнечаньня, стварыла ўсе ўмовы для магутнага разьвіцьця творчасьці Якуба Коласа. Гэта ясна ўсьведамляе і сам Колас. «Беларуская культурная справа, з якой я пазнаёміўся па прыезьдзе ў Менск (1921 г. — П. Г.), і ня перспэктывы пры савецкім урадзе на мяне зрабіла найлепшае ўражаньне, і я прышоў да такога перакананьня, што ні пры якім іншым урадзе ў цэлым сьвеце нацыянальная культура і справа адраджэньня прыгнечаных нацый не пастаўлены і ня могуць быць пастаўлены ў такія спрыяючыя ўмовы, як пры савецкай уладзе».

Сапраўды, толькі ва ўмовах савецкай улады Я. Колас поўнасьцю разгарнуў свае творчыя сілы, узбагаціўшы нашу літаратуру новымі вынікамі мастацкімі творамі.

Я ні ў якай меры не дапускаю думкі, што ў нашы дні ўжо можна падвесьці вынікі творчасьці Коласа. Якуб Колас зараз у поўным росквіце сваіх сіл. Рашучая перабудова аднаасобнай карлікавай сялянскай гаспадаркі на сацыялістычны шлях, барацьба бядняцка-серадняцкіх мас за калектывізацыю, як адзіную форму зьнішчэньня шматвяковага прыгнечаньня, адкрываюць новыя палотны для творчасьці Якуба Коласа.

Колазам ужо даны першыя нарысы гэтага новага этапу ў яго творчасьці. Я думаю, што многім ужо вядомы калгасныя творы паэта, якія ён зьмясьціў яшчэ ў 1930 годзе ў «Маладняку» (№ 3).

У вершы «СТАРАЯ ВЁСКА» Якуб Колас заклікае да рашучай барацьбы з гэтай вёскай:

Чаго жаль тебе, гаротная?
Загонаў, дзе цьвіце сурэпа,
Смыкна, сахі, сярпа і цэпа,
Каб так чапляцца за іх сьлепа?
Пара іх кінуць беззваротна!
Зірні наперад зоркім вокам,
У наша сёньняшняе раньне...
Вітай для новага сьвітаньня,
Ідзі машынам на спатканьне
Ды грамадою, цьвёрдым крокам!
«Мая зямля», «мой поплаў», «паша»,
«Мой луг», «мой конь», «мае каровы»—
Зьліняўся, старыя словы!
Пара, пара дзець сэнс ім новы:
Зьмяніць іх чос на «наш» і «наша»!

У вершы «Серадняк» Якуб Колас высьмейвае хістаньні серадняка і ў высока мастацкай форме расказвае, што толькі цвёрда і несьвядомасьць устрымлівае некаторых сераднякоў ад уступленьня ў калгас.

Творы, напісаныя Якубам Коласам у апошнія два гады, — гэта бадзёры прызыў да новага непаўтыўнага жыцьця. У сваіх творах Колас ніколі не забывае і сваіх братоў, пралетарыят і працоўнае сялянства Заходняй Беларусі, якія адчуваюць на сабе жахі прыгнечаньня польскага і беларускага пана і кулака. Я думаю, далёка невыпадкова, што іменна ў дзень свайго юбілею сёньня Якуб Колас апублікаваў свой новы твор аб Заходняй Беларусі. Гэта лепшы адказ беларускім рэнегатам Луцкевічам, Багдановічам, Чарнецкім, Астрэўскім, якія ліжуць абсацы польскага пана. Яны таксама ладзілі сьвяткаваньні юбілей Якуба Коласа, дзе старанна ачарніць сапраўдны твор нашага народнага паэта. Ка гэн даўно ў «Кур'еры Віленскім» была зьмешчана нотатка, як праводзіўся юбілей Я. Коласа ў Вільні. Нефуфырэныя польскія і беларускія пані слухалі дакляды махровых рэакцыянэраў Чарнецкага і Багдановіча. Але-ж ніякая хлусьня панаў Чарнецкіх і Багдановічаў на зьмяншыць ролі Я. Коласа, як песьняра працоўнага беларускага селяніна, які пад кіраўніцтвам пралетарыяту вядзе барацьбу за калектывізацыю і да глыбіні душы ненавідзіць польскіх акупантаў, зьнішчальнікаў беларускай культуры.

У заключэньне дазвольце выказаць упэўненасьць, што Я. Колас і далей будзе ісьці ў першых радох і рашуча змагацца за сацыялізм.

50 год засталі Якуба Коласа ў поўным росквіце сіл. Невыпадкова, калі ён даведаўся, што зьбіраюцца сьвяткаваць яго 50-годзьдзе, ён адмовіўся да гэтага некалькі гіранічна, бо на справе ён адчувае сябе маладым, быццам яму не пяцьдзесят год, а ўсяго толькі два разы па 25.

Працуючы на працягу гэтых двух год у Акадэміі разам з Я. Коласам, я заўсёды прыслухоўваюся, захапляюся яго высокай культурнасьцю, вялізарнай эрыдыцыяй і працаздольнасьцю. Асабліва вялікае бачыць у яго жывой крыніцай імкненьне наперад. Недарма Э. Зола ў свазім творы «Дэтэр Пасьвяў» гаворыць, што «адзінае шчасьце жыцьця — гэта бясупынное імкненьне наперад». Гэтым шчасьцем упадае Я. Колас. У гэтым бясупынным рэвалюцыйным імкненьні наперад — зарука далейшага разьвіцьця творчасьці Коласа, зарука яго шчыльнай сувязі з пралетарыятам, зарука яго барацьбы з усімі тымі, хто перашкаджае будаўніцтву сацыялізму.

Слова юбіляра Якуба Коласа

«Проч, сапаменныя страхі,
Цесны двор і катухі.
Мы другія ставім вехі, —
Камунізм гудзе ном рахам
І пашэвае шляхі».

ЯКУБ КОЛАС.

ТАВАРЫШЫ!

Калі-б два—пяцьдзесяці гадоў таму назад маім вачам прапанаваўся той стан, той маляўнак культурных, нацыянальных здабыткаў народаў Саюзу Савецкіх Сацыялістычных Рэспублік і ў тым ліку Савецкай Беларусі, здабыткаў, якія маем мы на сёньняшні дзень, то я не паверыў-бы ў іх рэальнасьць, я палічыў-бы іх за казку, за ігру фантазіі. А між тым пашчасьцілі савецкай улады і камуністычнай партыі, пры дапамозе брацкіх, савецкіх рэспублік гэта фантазія ператворана ў сапраўдную рэчаіснасьць. Ці трэба гаварыць аб іх тут, калі яны перад нашымі вачыма? Даволі адзначыць толькі перамогі гэтых культурных дасягненьняў, здабытых Савецкай Беларуссю на адзіным ленінскай нацыянальнай палітыкі, каб рэальна адчуць іх велічэ.

І сапраўды, такія здабыткі культурнага буйнаўзнаўства, як Акадэмія Навук, Дзяржаўны ўніверсытэт, дзесяткі ВНУ і ВТНУ, сотні тэхнікумаў розных спэцыяльнасьцей, тысячы сярэдніх і пачатковых школ, дзе гучыць беларуская мова і фармуецца новы чалавек; дзяржаўная бібліятэка з мільённым кніжным фондам; дзяржаўнае выдавецтва з шматмільённым тыражом беларускіх, яўрэйскіх і іншых выданьняў, беларускія дзяржаўныя тэатры і тэатры іншых нацыянальнасьцей БССР — хіба гэта не гаворыць аб грандыёзнасьці нашых культурных здабыткаў?

Здабыткі гэтыя толькі частка, толькі адно зьвяно, адна шпонка ў шэрагу іншых здабыткаў сацыялістычнага буйнаўзнаўства нашай краіны. І ўсё гэта зроблена за дваццаць і то няпоўных год, здабыта пры напружанай, варожай міжнароднай абстаноўцы, у атмасферы фальшывак, палітычных хаваньняў, маліцыі розных палітычных пройдзісьветаў і авантурыстаў, у атмасферы злоў, інтрыгаў, шпіёнскіх замахаў, напіраньняў супроць Саюзу Савецкіх Рэспублік. Усё гэта здабыта ў момант вострага клясавага змаганьня ўнутры краіны пры тысячы розных перашкод як у форме звычайнага шкодніцтва, так і ў вяне патаемнага і яўнага супраціўленьня з боку контрэвалюцыйнага нацыянал-шавінізму.

Калі беларуская літаратура старой, дарэвалюцыйнай Беларусі была прадстаўлена некалькі імёнамі, для пералічэньня якіх хапала пальцаў адной рукі, то сучасная савецкая літаратура прадстаўлена сотнямі імён, дасягнамі маладых выбатных талентаў, чыю мастацкую працуцыю можна смела выносіць у людзі. Чым глумачыцца гэтыя посьпехі, гэты гігантскі рост нашай культуры? Тым, што Кастрычніцкая рэвалюцыя, вызваліўшы шматмільённыя масы працоўных ад пёўту капіталу, дала шырокі прастор і ўсе магчымасьці для выяўленьня і рэалізацыі іх творчых здольнасьцей і што сама савецкая рэчаіснасьць ёсьць бурная навычэрпная крыніца паэзіі тварэньня, паэзіі змаганьня за буйнаўзнаўства сацыялізму, за новага чалавека, за новы быт у свабодным бясклясавым грамадзтве.

Калі я аглядаю пройдзеную дарогу, сваю літаратурную дзейнасьць у беларускім пісьменстве, то сама Беларусь перада мною паўстае ў трох постацях: старая Беларусь часоў царызму, Заходняя Беларусь пад польскай акупацыяй і Беларусь Савецкая. Успамінаючы старую Беларусь, я не магу ня ўсьміхнуцца аб Зах. Беларусі, і параўнаньне іх напрошваецца само сабою. Старая Беларусь была «западной окраиной», калёніяй расейскай імперыі, ЗБ стала «ўсходнімі крэсамі», калёніяй польскага капіталізму. Адну Беларусь клявуў двуагаловы царскі арол, другую рве адногаловы польскі «бялы орол».

Царская Беларусь ведала эпохі Мураўёва, Сталыпіна з іх карнымі экспэдыцыямі, вешанні-палівымі сунамі, расстрэламі, шыбеніцамі. ЗБ ведае эпоху Мазэпіча і яшчэ ў больших разьмерах карныя экспэдыцыі, вешанні-палівыя сунамі, расстрэлы і тыя-ж шыбеніцы. Калі царскі ўрад у дачыненьні да культурных патраб працоўных мас станавіўся варожа і пруба выгнаў са школ усё, што закранала-б нацыянальныя асаблівасьці, — то панская фашысцкая рэакцыя нанесла штрафы за ўжываньне дзецьмі ў школах свайго матчынага слова.

Чыёй і чыяць гвалт і зьнекі пад працоўным народам, над яго лепшымі сынамі, змагарамі за справу працоўных мас, за іх вызваленьне з сацыяльнай і нацыянальнай няволі. І тыя-ж самыя царскія законы аб палітычных «преступніках», аб «крамольніках» заступаюць сваю сілу і зараз на Заходняй Беларусі.

І рэзыліца пазнак імі (старой царскай і сучаснай ЗБ) толькі тая, што адна цяжка стагнала, скованая кайданамі царскай няволі, а другая гняла крывавымі сьлёзамі, узьведзеная на эшафот фашысцкай Польшчай, якая да рэчы сказаць, задыхаецца ў экзэмэнчным крыжсе, ня бачачы з яго выхаду.

Калі параўнаць гэтыя тыя постаці — царскай і ЗБ з Савецкай Беларуссю — і калі прыняць пад увагу вашы вялічэзныя здабыткі на фронце сацыялістычнага буйнаўзнаўства, нашы пасьпяховы поступ наперад, пераўтварэньне БССР з краіны аддталай, з былой царскай калёніі ў краіну індустрыяльную, то ясным, бясспрэчным стане факт, які гаворыць аб тым, што ні буржуазны лібералізм нацыянал-дэмакратычнай афарбоўкі, ні рэакцыйны фашызм у гусьце сацыял-шавінізму, а толькі ленінская нацыянальная палітыка, толькі дыктатура пралетарыяту і кіруючая роля камуністычнае партыі забясьпечваюць народам буйны рост іх нацыянальнай культуры — нацыянальнай па форме, сацыялістычнай па зьместу.

У гэты вечар, калі савецкая грамадзкасьць тут у Савецкай Беларусі адзначае мае пяцьдзесяцігодзьдзе, я павінен сказаць некалькі слоў з повазу майго юбілею, адсьвяткаванага там, на акрыжаўленых гонях ЗБ, на гонях, залітых крывёю рэвалюцыянэраў — змагароў за нацыянальныя і сацыяльныя інтарэсы працоўных мас, акупаваных польскім фашызмам. Сьвяткаваньне там абылося 27 дістапада, напярэдадні суда над тав. **ТАРАШКЕВІЧАМ.**

Мяне агортвае вялікі смутак, калі я думаю аб сьвяткаваньні там майго юбілею. Хто яны, гэтыя людзі, ініцыятары юбілею? Чыю выконваюць яны волю? Чыю робяць справу? Ці справу працоўных мас беларускага народу, ад імя якога яны выступаюць, ці справу польскага фашызму, падняволенага беларускі народ?

Даволі назваць два імёны з гэтай групы: ксяндза Станкевіча і манархіста Багдановіча, каб мець уяўленьне аб ідэалёгічным твары ўсёй працы, де палітычных устаноўках. Гэта група так званых хрысьціянскіх дэмакратаў, або іначай хадэкаў. Пад «пявучай» шыльдай культурніцтва, прыкрываючыся «левымі» фразамі і лёзунгамі, гуляючы ў адмоцыю з польскім урадам, пад прынцыпам апекай польскай паліцыі, тэй паліцыі, якая таксама авяжуецца, але апекай іншага парадку над тысячамі палітзьняволеных за кратамі польскіх турмаў, яны, гэтыя «культурныя» людзі, усю сваю дзейнасьць, усю сваю мэтаімкнёнасьць накіроўваюць на тое, каб прыгнуціць, згладзіць вострасьць палітычнага змаганьня працоўных мас за сваё нацыянальнае і сацыяльнае выкваленьне, каб адарваць іх ад уплыву, які мае на іх кампартыя Заходняй Беларусі, каб зьвярнуць іх з адзінага пралетарскага шляху выкваленьня па якім вядзе іх кампартыя ЗБ.

Яны сьвядома дапамагаюць польскаму фашызму задушыць вызвалечы рух паняволенага народу. Уся іх дзейнасьць вядзецца ў шчыльным кантакце з адпаведнымі арганізацыямі польскай улады. Ёсьць дакумэнты, матар'ялы лідэраў хадэцыі, гэтага зборышча мэнархістаў, клерыкалаў, памешчыкаў, дзе яны адкрыта гавораць аб тых спосабах, якія, па іх думцы, трэба ўжываць, каб закалыхаць клясавую чуйнасьць працоўных мас, каб прадаць іх інтарэсы польскаму фашызму. Вось хто яны, гэтыя «культурнікі». Вось іх палітычнае аблічча. І калі ў нас выкінкае пачуцьцё абурэньня, нянавісьці і агіды панура сярдзіныкавая постаць польскага ката — прафэсыянала Мацьцеўскага, якія не спраўляюцца вешаць асуджаных на шыбеніцы, дык хто-ж такія гэтыя «культурнікі», што сваёй дзейнасьцю натхняюць катаў Мацьцеўскіх, працяроблываюць ім дарогу крыві, дарогу на галгофу лепшым сынам працоўных мас Заходняй Беларусі.

Мой грамадзкі абавязак перад працоўнымі масамі ЗБ, чыю пядоню апявала мая юнацкая муза, за чые інтарэсы я стаю і буду стаяць пад сьцягам ідэалаў камунізму, прымушае заявіць гэтым палітычна-збанкрутаваным людзям: «Вы сьвядома забіваеце жывыя струмені нарэшнага руху, вы гасіце агонь сацыяльнага вызваленьня працоўных мас, без чаго ня можа быць вызваленьня нацыянальнага. Вы прадаяце працоўныя масы акупантам Беларусі ў нацыянальнае і сацыяльнае няволю польскага фашызму. НА ВАШАЙ АДЗЕЖЫ КРОЎ ЛЕПШЫХ СЫНОЎ БЕЛАРУСКАГА НАРОДУ. НЕ СПЯКУЙВАЙЦЕ МАНІ ІМЕМ У ВАШЫХ РЭАКЦЫЙНЫХ І КОНТР-РЭВАЛЮЦЫЙНЫХ МЭТАХ.

Таксама я літу маім абавязкам перасьцерагчы моладзь ЗБ, падаўшую пад уплыў хадэцыі, не станавіцца на той шлях, на які кліча яе ідэалёгі хадэкаў. Нехай узважыць яна чуллівую вагою маладога розуму і чыстых жарываў юнацкага сэрца той «духоўны хлеб», што пасьпосьць ёй хадэкі рукамі ксяндза Станкевіча. Я веру, што гэтыя парывы маладога сэрца дапамогуць ёй выблытацца з павуцінньня хадэцкай і нацыянал-эдрадэцкай рэакцыі і шчыльна ўліцца ў рады працоўных мас, каб ісьці з імі ў нагу пад кіраўніцтвам кампартыі ЗБ па адзіна верным і правільным шляху клясавага змаганьня супроць нацыянальнай і сацыяльнай няволі.

Канчаючы свае словы, я зварачаюся з заклікам да таварышоў пісьменьнікаў: таварышы пісьменьнікі, маладая зьмена! Вашы літаратурныя здабыткі вялікія і цэнныя, але не супакойваўцеся на іх. Вялікі яшчэ і рахунак, які прад'явіла нам, пісьменьнікам, наша вялікая гістарычная эпоха, і гэты рахунак яшчэ далёка намі не аплачан.

Прыкладзем яшчэ больш намаганьня, яшчэ больш клясавай пільнасьці, яшчэ цясьней згуртуемся вакол камуністычнай партыі і цалкам аддамо сваю мову справе сацыялістычнага буйнаўзнаўства, справе абароны нашай краіны, лабудзе бясклясавага грамадзтва.

Няхай жыве і квітнее наша моладзь!

Няхай бурліць маладое радаснае жыцьцё!

Няхай жывуць будаўнікі гэтага новага здаровага сацыялістычнага жыцьця і іх кіраўнік — камуністычная партыя!

Аб дзейнасьці некаторых судовых работнікаў

па справах раскрадваньня збожжа, спэкуляцыі і г. д.

Пастанова ЦК КП(б)Б і СНК БССР ад 20 сьнежня 1932 г.

1. Адзначаючы, што рад сьледчых і народных суддзяў судовага апарату БССР дапушчаюць выпісваньне выключна мяккіх, лібэральных прыгаворў у адносінах да распрадвальнікаў збожжа, спэкулянтаў, жулікаў, што зьяўляецца простай супярэчнасьцю існуючых пастановам ураду Саюзу і БССР аб барацьбе за захаваньне сацыялістычнай маемасьці і ўстанаўленьне сапраўднай рэвалюцыйнай законнасьці, абаранаючай інтарэсы пралетарскай дзяржавы і сацыялістычнай уласнасьці,—ЦК і СНК БССР пастанаўляюць:

1. Народнага суддзю Касьцюковіцкага раёну Мельніжава, у мінулым белагвардзейца і зараз пралезшага ў судовы апарат, які вынес выключна мяккія прыгаворы па справах раскрадваньня памольнага збожжа і раду іншых,—з работы неадкладна зьняць.

2. Народнага суддзю другога вучастку г. Менску Міхаева, за затрыманьне і цягаціну па справе аб спэкулянтах, ня глядзячы на выстарчальную палучанасьць сьледчых паказаньняў і асабістае прызнаньне падсудных, з работы неадкладна зьняць.

3. Народнага суддзю Касьньева (Рагачоўскі раён) за выпісваньне выключна мяккага прыгавору на справе накражы тавараў па кількую суту, які сваім прыгаворам фактычна патураў жулікам, злодзеям і грабежнікам,—неадкладна з работы зьняць.

4. Сьледчага НКЮсту БССР па важнейшых справах, члена партыі Ратнера—за цягаціну і аслабаненьне арыштаваных па буйнай справе хабараў і за разлажэньне за гатоўчага апарату,—неадкладна з работы зьняць. Даручыць ЦКК РСІ тэрміново вырашыць пытаньне аб яго партыйнай прыналежнасьці.

5. Сьледчага НКЮсту БССР Юдзкевіч—за выключную цягаціну (жнівень 1932 г.) па справе групы раскрадальнікаў і мошэнікаў, якія займаліся падлогамі, грабежамі і г. д.,—з работы неадкладна зьняць.

II. Прапанаваць НКЮсту прыцягнуць да судовай судовай адказнасьці ўсіх пералічаных у данай пастанове работнікаў судова-сьледчага апарату і праз пяць дзён далажыць аб прынятых мерапрыемствах.

III. Зьвярнуць увагу тов. Судакова на неадпаўчальнасьць падобнай практыкі работы судова-сьледчага апарату і на невыстарчальны нагляд з боку кіруючых работнікаў НКЮсту, пракуратуры і Вярхоўнага суда ў адносінах падпарадкаваных ім работнікаў.

Даручыць т. Судакову прыняць усе необходныя меры да рашучага выкараньня подобнай практыкі работы пасобных судовых работнікаў.

Сакратар ЦК КП(б)Б ГИКАЛО.
Старшыня СНК БССР ГАЛАДЗЕД.

Аб утойваньні таварнай прадукцыі па сыстэме Малпрамтрэсту

Пастанова ЦК КП(б)Б ад 20-XII 1932 г.

1. За утойваньне таварнай прадукцыі ад дзяржавы ў разьмеры 568 цэнт. лёкна і дачу наяраньняньных вестак свайму абъяднаньню дырэктара сайтнаў «Пятроліва», Полацкага раёну, т. Акуліча, члена партыі, з работы зьняць. Прасіць ЦКК тэрміново выраішыць пытаньне аб яго партыйнай прыналежнасьці.

2. Дырэктара саўгасу імя Калініна, Менскага раёну, т. Шкуро за ашуканьне дзяржавы і утойваньне ўраджаю на 228 цэнт. з работы зьняць. Прасіць ЦКК тэрміново выраішыць пытаньне аб яго партыйнай прыналежнасьці.

3. Прапанаваць НКЮсту прыцягнуць т. т. Акуліча і Шкуро да суровай судовай адказнасьці з разборам справы ў 3-дзённы тэрмін.

4. Былому кіраўніку Малпрамтрэсту тав. Сьмірнову, які ня прыняў адпаведных мер для выяўленьня таварнай прадукцыі па ёй сыстэме і тым самым спрыяў утойваньню ад дзяржавы таварнай прадукцыі саўгасаў, абвясьціць суровую вымову.

5. Прапанаваць кіраўніку Малпрамтрэсту т. Сьцяпанаву на працягу 5-ці дзён правесьці выяўленьне па сваёй сыстэме лішкаў таварнай прадукцыі і перадаць іх дзяржаве, папярэджаўшы, што пры паўтарэньні ў далейшым падобных фактаў паўстане пытаньне аб яго партыйнасьці і прыцягненьні да судовай адказнасьці.

Старшыня СНК БССР ГАЛАДЗЕД.
Сакратар ЦК КП(б)Б ГІКАЛО.

Забастоўка вучняў сярэдніх школ у Баўгарыі

ВІЦНА, 19. **У Баўгарыі адбываюцца далей забастоўкі вучняў сярэдніх школ**, абвешчаныя супроць павышэньня платы за вучобу, а таксама супроць звальненьня са школ раваюцыйных вучняў. Забастоўкай кіруе юнацкая сэкцыя рабочай партыі.

У правінцыяльным горадзе **Хаскаве** была абвешчана забастоўка 220 вучняў супроць выключэньня з мясцовай гімназіі 14 рэвалюцыйных вучняў. У горадзе **Карманлі** вучні сярэдніх школ абвясьцілі забастоўку ў знак пратэсту супроць правакацый з боку нацыяналістскіх вучняў. У **Шумені абвешчана забастоўка салідарнасьці з бастуючымі ў Хаскаве.** Паміж дэманстраваўшымі вучнямі шуменскіх школ і паліцыяй адбылася сутычка, у рэзультаце якой адзін паліцэйскі паранен, **20 вучняў арыштавана.** Апублікаван сьпіс 200 вучняў шуменскіх школ, зволеных з «воўчым білетам» (бяз права паступленьня ў якія-небудзь іншыя навучальныя ўстановы Баўгарыі).



НА ЗДЫМКУ: Выпрабаваньне новай 16-цідзюймовай гарматы ў ПАЗШ.

Трывога польскай буржуазіі

ВАРШАВА, 19. Пазнанскі орган памешчыкаў «Дзеньнік Пазнанскі» апублікаваў гэтымі днямі артыкул, які характарызуе настрой буйных аграрыяў у сувязі з абвастраньнем аграрнага крызісу ў Польшчы. «Ня ма чаго скрываць фактаў, — пісаў «Дзеньнік Пазнанскі». — Становішча ў нас драпнае, а быць можа безнадзейнае. Крызіс у вёсцы з эканамічнага ператварыўся ў сацыяльна-палітычны. З гаўтоў, капальняў і фабрык бягуць у вёску беспрацоўныя, у маёнтках звальняюцца сельска-гаспадарчыя рабочыя. Адсутнасьць работы, голад дэмаралізуюць гэтых людзей».

Варшаўская памешчыцкая газэта «Дзень польскі» ў трывожным тоне заклікае ўрад выплаціць 10 млн. злотых для пакрыцьця затрыманай зарплаты сельска-гаспадарчым рабочым у імя «сацыяльнай бясьпечнасьці».

Жудасная статыстыка

ВІЛЬНЯ. Далейшае паглыбленьне гаспадарчага развалу ў фашысцкай Польшчы, бязупынны рост беспрацоўя, голаду, галечы выклікае павялічэньне колькасьці самагубстваў. Зразумела, што самагубствам канчаюць толькі адзінкі сярод беспрацоўных, вытрымаць з жыцьцёвай калізіны. Пераважаючая-ж маса беспрацоўных, пад кіраўніцтвам кампартыі з кожным днём усё больш зацята вядзе барацьбу супроць фашысцкай дыктатуры. У адным з апошніх нумароў «Дзеньніка Віленскага» падаецца статыстыка самагубстваў у г. Вільні і Віленшчыне. Так, на працягу 11 месяцаў бягучага году ў Вільні зарэгістравана **189 замахаў на самагубства, з якіх 112 скончыліся сьмерцю.** Пераважаючая частка самагубстваў — **149 чал. прыпадае на беспрацоўных.** Як зазначае нават энэцкая газэта прычыны самагубства — **звальненьне з працы, беспрацоўе, голад, безнадзейнасьць атрымаць працу ў будучым.**

У правінцыі толькі за апошнія 6 месяцаў здарылася **88 самагубстваў.** Павялічэньне самагубстваў у вёсцы тлумачыцца эрэўнаваньнем дапчэнту працоўнага сялянства. Непасільны падатковы цяжар, продаж з малатка гаспадарак, голад — вось прычыны павялічэньня самагубстваў у вёсцы.

Як канстатуе «Дзеньнік Віленскі», колькасьць самагубстваў на тэрыторыі Віленшчыны ўзрасла ў параўнаньні з мінулым годам **на 90 проц.**

Сыгналы з Барысаўскага лесрабфаку

Пастановы ЦК УсеКП(б) і ЦВК СССР аб сярэдняй і вышэйшай школе, якія забясьпечваюць карэннае палепшэньне работы па падрыхтоўцы пралетарскіх кадраў, не знайшлі ні малейшага праламленьня ў рабоце Барысаўскага лесрабфаку. Гэтыя пастановы былі абгавораны на сходах настаўнікаў і студэнтаў. Аб рэалізацыі гэтай пастановы ні дырэкцыя, ні партыйная ячэйка рабфаку не клапаціліся.

У рабфаку няма цьвёрдых навучальных плянаў, заняткі праводзяцца па старой праграме. У лесашколе адсутнічае ясна акрэсьлены напрамак спэцыяліста. Як правіла, заняткі праводзяцца выключна брыгадна-лябараторным мэтадам. Адсутнічае ўвязка ў выкладаньні паміж апалягічнымі дысцыплінамі (матэматыка — фізыка, грамадазнаўства—літаратура).

Выкладчыцкі склад у радзе выпадкаў больш заклапочан «нагонам гадзін», чым зьместам сваёй лекцыі, у выкладаньні нярэдка дапускаюцца скажэньні зьместу.

Адсюль і вынікі. Многія студэнты 4-га курсу блытаюцца ў цэлым радзе пытаньняў: некаторыя лічэ не ўсьвядомілі цьвёрда і ясна сацыялістычнага характару нашых прадпрыемстваў. Няма правільнага разуменьня аб клясах і суадносінах клясавых сіл у сучасны момант у Савецкім саюзе і г. д.

Такое зьявішча будзе зразумелым, калі мы паглядзім на склад настаўніцтва, абслугоўваючы апарат і кіраўніцтва рабфаку. Тут знайшлі сабе прытулак дачка генэрала Тарноўская, былы палкоўнік **Чарапеньнікаў**, валасны пісар **Козел**, сын кулака Фэдарынчык, вядомы ў Барысаве, як прыхільнік беларускага нацыянал-дэмакратызму і, нарэшце, настаўнік **Марозаў**, які і да гэтага часу кіруецца на сваіх уроках грамадзянкай Лёсіка.

Гэта плямо былых людзей зьявіта ў лесрабфаку пры прыхільным патураньні былога дырэктара Талкачова і яго памочніка **Урбана**, якія, страціўшы клясавую чуласьць, апынуліся ў балоце апартунізму.

Якая справа **Талкачову** да таго, як калечаць студэнтаў клясава-варожыя людзі пад маскай савецкага настаўніка? Ён нацьлявацельскі махнуў на ўсё рукой, задаўся мэтай асабістага дабрабыту. Яго дэвіз— «найбольш урваць». Ад «выработку» за лекцыі 564 руб. у чэрвені месяцы, ужо ў жніўні ён перагнаў за 1.000. У налічэньні сабе «вучэбных гадзін» толькі і думаў аб тым, каб за суткі не налічыць больш 24 гадзін. А ўсё астатняе будзе шыта-крыта. За ім пацягваліся **Урбан, Фэдарынчык** і іншыя. Пры ўплаце членскіх узносаў, пры падпісцы на пазыку, ніхто з іх не паказваў фактычнага заработку.

Талкачоў сваё рвацтва і рвацтва сваіх калег расцэньваў ня інакш, як «ударніцтвам». А таму прэміяльны фонд быў падзелен прапарцыянальна паміж **Талкачовым, Урбанам, Фэдарынчыкам** і сакратаром партячэйкі **Мікуцкім.** Апошні зьяўляўся акуратным штампавычыкам усіх злачынстваў дырэкцыі, злосным глушыцелем крытыкі ў імя «аўтарытэту» кіраўніцтва рабфаку.

Для аблягчэньня такой «работы» рэдактарам насьценгазэты быў пастаўлен надзейны чалавек—брат заг. навучальнай часткі **Фэдарынчык**, які ні адной заметкі не прапускаў па адрасе начальства.

Апартуністычная практыка дырэкцыі, палітычная сьлепата кіраўніцтва партячэйкі, грубы заціск самакрытыкі прывялі да сур'ёзных нездаровых зьявішчаў. У рабфаку рэзка заняпала дысцыпліна, заняткі часта зрываліся як па віне настаўнікаў, так і па прычынах нявучкі самых студэнтаў. Склад рабфаку засмечан клясава-варожымі элемэнтамі. Сацыяльным складам кіраўніцтва ня цікавілася. Сакратар камсамольскага калектыву Бабіцкі садзейнічаў прыёму ў рабфак дачкі паліцэйскага. Бытавое разлажэньне, п'янкі, сьпевы контр-рэвалюцыйных песьняў—усё гэта мела месца ў рабфаку і лесашколе.

Аб гэтых нездаровых зьявішчах камсамольцы сыгналізавалі Барысаўскаму райкому ЛКСМБ, але гэтыя сыгналы ў адно вуха кіраўніцтва райкамолу ўляталі, а праз другое вылятаді. Барысаўскі РК ЛКСМБ «працуе» дакладна па пляну, абавязкова толькі ў габінэце на мэтаду:—выклікаць, заслухаць і ў рэзалюцыі запісаць». Далей гэтага — ні-ні.

Усе гэтыя злачынствы і нездаровыя зьявішчы выкрыты зараз брыгадай райкому партыі. Абмеркаваўшы становішча лесрабфаку і лесашколы, райком КП(б)Б пастанавіў: распусьціць бюро ячэйкі КП(б)Б, праф ком і рэдакцыю насьценнай газэты. Былы дырэктар **Талкачоў** выключан з партыі. Сакратару партячэйкі **Мікуцкаму** абвешчана суровая вымова. Зьняты з работы нам. дырэктара **Урбан**, заг. навучальнай часткі **Фэдарынчык**, настаўніца **Тарноўская**, сакратар рабфаку **Чарапеньнікаў** і бухгальтар **Козел.**

Івашын і Лысак.

Візыт польскага генэральнага консула ў Менску да ўпаўнаважанага НК Замежных спраў

Вык. аб. Упаўнаважанага НК Замежных спраў СССР пры ўрадзе БССР т. Я. Т. ГУСТЫР прыняў польскага генэральнага консула ў Менску п. Ялавецкага і прыбыўшага ў Менск аташэ польскай місіі ў Маскве п. Забэлла.

Польскі генэральны консул п. Ялавецкі 21 сьнежня выяжджае ў 1½ месячны адпачынак. Абавязкі польскага генэральнага консула ў Менску будзе выконваць п. Забэлла.

(Белта).

Паведамленьні

— Партканфэрэнцыя ЦКК КП(б)Б паведамляе, што 29 сьнежня, у 10 гадз. раніцы, у г. Полацку будзе працаваць вышэйшая ПТ ЦКК КП(б)Б пад старшынствам т. Блоштэйна па разгляду партспраў Полацкага, Вушацкага, Расонскага і Дрысенскага раёнаў. Выклікаюцца наступныя т. т.: на 29 сьнежня у г. Полацку: Велікаў П. А., Шарар Ф. Ф., Растуцкі Н. М., Сьлядзінскі В. А., Гуськоў Я. С., Провал С. П.—Вушацкі раён: Брозэнман І. С., Варабейчык І. С., Шпакоў М. І., Бабакоў С. Ц. — Полацкі раён: Хадкевіч Я. Р., Жвірбля М. М., Калачоў Е. К., Сэўчанка У., Рубіс П. — Дрысенскі раён.

— Менская рэспубліканская 2-гадовая сэўпартшкола паведамляе, што ўсе таварышы, якія падалі заявы-анкеты ў СПШ і яшчэ не прайшлі па якіх небудзь прычынах іспытаў, павінны абавязкова зьявіцца на іспыты 24-га сьнежня г. г., у 7 гадз. вечара, у клюб мэталістаў на Універсытэцкай вуліцы. Павінны зьявіцца: Сапожкін І. А. (Хлебазавод), Круглман Ш. Л. (Хлебакамбінат), Солава С. А. (цагельня № 1), Лупшыц («Ударнік»), Мысьліўчык М. І. (Вадаканалтрэст), Гаралы (вагонны дэпо), Лінман («Камунарка»), Каштелон (МРВ), Міланові І. А. («Ударнік») і іншыя, якія не прайшлі іспытаў. Сакратаром забясьпечыць яўку абавязкова.

АДКРЫЛАСЯ СЭСІЯ АКАДЭМІІ НАВУК БССР

Першы дзень работы сэсіі

Учора пры перапоўненай залі Дому Камасьветы пачала работу чарговая сэсія Акадэміі Навук БССР, прысьвечаная павышэньню ўраджайнасьці сельскай гаспадаркі.

Адкрываючы сэсію, прэзыдэнт Акадэміі тав. **П. ГОРЫН** выступіў з вялікай прамовай аб сацыялістычным будаўніцтве і задачах навукі на даным этапе. Тав. **Горын** указаў на непарыўнае адзінства навукі і сацыялізму і заклікаў усіх навуковых работнікаў шчыльней згуртавацца вакол камуністычнай партыі і пад яе кіраўніцтвам яшчэ з большай адданасьцю змагацца за вырашэньне задач другой пяцігодкі.

Тав. Горын заклікаў усіх вучоных, грытсутных па сэсіі, прыняць самы непасрэдны, практычны ўдзел у вырашэньні задач павышэньня ўраджайнасьці, у прыстасаваньні навукі і яе шматгадовых вопытаў да сацыялістычных палёў.

Неадменны сакратар Акадэміі тав. **Панкевіч** агалосіў прывітальныя тэлеграмы ад Усесаюзнай і Усеўкраінскай Акадэмій Навук. Сэсія ўхваліла пасылаць прывітаньні **ЦК УсеКП(б), ЦК КП(б)Б, СНК і ЦВК БССР.**

Тав. **Трушкевіч**, калгасьнік калгасу імя Дзяржынскага, Менскага раёну, перадаўшы работнікам навукі прывітаньне і расказаўшы аб сваіх дасягненьнях у павышэньні ўраджайнасьці за 1932 г., ад імя ўсіх калгасаў БССР **ПРАД'ЯВІЎ СЭСІІ САЦЫЯЛІСТЫЧНЫ РАХУНАК** на значна большую дапамогу Акадэміі па ўкараненьні агратэхнікі і дасягненьняў савецкай навукі ў практыку сацыялістычнага земляробства.

Сэсія прыступіла да дзелавой работы. Акадэмік **О. К. Кедраў-Зіхман** выступіў з дакладам на тэму: **«Праблема хэмізацыі земляробства ў БССР».**

ВІЦЭ-ПРЭЗЫДЭНТ АКАДЭМІІ СУРТА І. З.

За моцную сувязь тэорыі і практыкі

Парадак дня нашай сэсіі робіць яе самай цікавай ва ўсёй гісторыі АН БССР. Калі раней сэсіі склікалася толькі на аргпытаньнях, то цяперашняя ідзе па лініі вырашэньня **буйнейшых пытаньняў тэорыі і практыкі сельскай гаспадаркі.**

Паставіўшы ў парадак дня работы сэсіі цэнтральнай праблемай **падняцьце ўраджайнасьці**, АН гэтым самым пашла ў нагу з рабочай клясай і з шырокімі масамі калгасьнікаў у галіне барацьбы за вырашэньне гэтай галоўнейшай на цяперашнім этапе праблемы. Пытаньні хэмізацыі сельскай гаспадаркі, барацьбы з захворваньнямі расьлін (бульба і інш.), вывучэньне клімэтычных і глебавых магчымасьцяй, праблема новых культур—усё гэта мае сваёй мэтай павышэньне ўраджайнасьці.

Такім зьместам сваіх сэсій БАН упяршыню становіцца на ўзровень пленарных работ другіх Акадэмій Навук СССР. Канчаецца арганізацыйны перыяд і пачынаецца другі пэрыяд у рабоце Акадэміі—**пэрыяд разгортваньня практычнай і тэарытычнай навукова-дасьледчай работы.**

Пастаноўка пытаньняў, зьвязаных з разьвіцьцём сацыялістычнай сельскай гаспадаркі, ёсьць экзамэн для раду інстытутаў Акадэміі: агра-глебавага, біялёгічнага, фізыка-тэхнічнага, эканамічнага і інш.

У першы раз мы ўстанавілі самую шчыльную сувязь з усеукраінскай Акадэміяй Навук, паслаўшы на сэсію тав. **Домбаля** і запрасіўшы да сябе рад навуковых спэцыялістаў з Украіны. Апрача гэтага, на нашу сэсію запрошан рад вучоных з навукова-дасьледчых устаноў Саюзу.

Разам з узмацненьнем сувязі паміж акадэміямі і навукова-дасьледчымі ўстановамі Саюзу і БССР, неабходна арганізаваць такую-ж сувязь і з пралетарскай грамадзкасьцю фабрык, заводаў, саўгасаў і калгасаў.

Неабходна, каб нашы прадпрыемствы зараз-жа прыступілі да арганізацыі ячэек садзейнасьці Беларускай Акадэміі Навук, канцэнтруючы іх вакол сваіх заводзкіх дасьледчых лябараторый.

Дакладчыкамі на нашай сэсіі ў пераважнай большасьці выступае навуковы маладняк, які працуе з вялікай энэргіяй, бальшавіцкімі тэмпамі, што зноў-такі сьведчыць аб вялікім росьце нашых пралетарскіх навуковых кадраў.

Але мы яшчэ невыстарчальна ўмацавалі нашы інстытуты навуковымі кадрамі, невыстарчальна разгарнулі работу інстытутаў, не забясьпечылі ў належнай меры плянаваньня навуковай работы, мы слаба зьвязаны з навуковымі ўстановамі Саюзу і камаль ня маем арганічнай сувязі з вытворчасьцю.

У той час, як польскі фашызм распраўляецца з рэвалюцыйнымі рабочымі і сялянамі Заходняй Беларусі, ліквідуе культуру працоўных, мы ў БССР даем вялікарныя паказальнікі гаспадарчага і нацыянальна-культурнага росту. Сэсія нашай Акадэміі служыць гэтаму доказам.

Адкрываючы нашу сэсію, мы, работнікі Беларускай Акадэміі Навук, пратэстуем супроць палітыкі прыгнечаньня працоўных мас Заходняй Беларусі польскім фашызмам, які ліквідуе беларускую культуру закрыцьцём школ, вынясьненьнем жорсткіх прыгавораў нашым акадэмікам (Тараішкевіч).

Наша задача—мацней увязваць тэорыю з практыкай сацыялістычнага будаўніцтва, узмацніць абароназдольнасьць нашай краіны.

ПРАФ. ВІТКОЎСК

Прыцягнуць пралетарскую грамадзкасьць

Пастановы ЦК УсеКП(б) і ўраду СССР, пастановы пленуму ЦК КП(б)Б аб тым, каб **«павярнуцца да барацьбы за лепшую пастаноўку аграцоўкі зямлі, да барацьбы за павышэньне ўраджайнасьці, як галоўнай і цэнтральнай задачы ў галіне сельскай гаспадаркі на данай стадыі разьвіцьця»**, ставяць перад польскім інстытутам пралетарскай культуры рад канкрэтных задач.

Удзел польскіх бядняцка-серадняцкіх мас у сацыялістычнай перабудове польскай вёскі вельмі значны. Калектывізацыяй ахоплена звыш 70 проц. польскіх працоўных мас. На тэрыторыі БССР у сучасны момант ёсьць звыш 200 польскіх калгасаў; у адным толькі Дзяржынскім раёне — 57 калгасаў.

Усё гэта паказвае, што польскі інстытут пралетарскай культуры мае значную базу для разгортваньня працы на лініі барацьбы за павышэньне ўраджайнасьці.

Да гэтага часу ПІПК у сваёй працы зьвяртаў пераважную ўвагу на вывучэньне і навуковую дапамогу Дзяржынскаму раёну. У плянах навуковай працы на 1933 г. прадугледжан ахоп і другіх больш буйных асяродкаў польскіх працоўных мас Плешчаніцкага і Капыльскага раёну.

Галоўная ўвага будзе зьвернута на вывучэньне арганізацыйна-гаспадарчага ўмацаваньня калгасаў, вывучэньне вытворчых працэсаў, брыгад і г. д.

Акадэмічная канфэрэнцыя Беларускай Акадэміі Навук дасьць для нашай навуковай працы неабходную навукова-тэарытычную базу, дапамоча ў вырашэньні важнейшых праблем, практычным ажыцьцяўленьні раду пытаньняў.

Аднак, прадукцыйнасьць работы гэтай канфэрэнцыі будзе бязумоўна залежыць ад ступені актыўнасьці ўдзелу ў працах канфэрэнцыі па толькі спэцыяльных інстытутаў Акадэміі як: агра-глебавы, геалёгічны, біялёгічны, хэмічны, эканомікі і г. д., але і ўдзелу іншых інстытутаў, а тым ліку і польскага інстытуту пралетарскай культуры.

Вакол працы акадэмічнай канфэрэнцыі трэба мабілізаваць увагу і арганізаваць дапамогу з боку пралетарскай грамадзкасьці. Польскі інстытут павінен у гэтай справе правесьці значную працу сярод польскіх працоўных мас і ў першую чаргу сярод польскіх калгасьнікаў.

Адказны рэдактар Г. Н. БРАГІНСКІ

Першы Дзяржаўны Тэатр БДТ
Сёньня Кузьма Чорны
БАЦЬКАЎШЧЫНА
Эпопея ў 4-х дзеях.
Пачатак у 8 гадзін вечара. Білеты ў раб. касе і касе тэатру.

10-ы ДЗЯРЖЗЬВЯРЫНЕЦ
ПРЫБЫЎ НОВЫ ТРАНСПАРТ
жывёл і птушак.
Зьвярынец адкрыт з 9 гадз. раніцы да 11 гадз. вечара штодзённа.
Па калектыўных заявах прадстаўляецца 50 проц. скідкі. Зварачацца ў кантору зьвярынцу загадзя.

ЧЫРВОНАЯ ЗОРКА — Гучны мастацкі фільм СУСТРЭЧНЫ
КАСА—ад 12 г. дня
ІНТЭРНАЦЫЯНАЛ — Мастацкі фільм ВЕЦЕР у ТВАР
Каса—ад 12 г. дня — Заяш прагр. кіно-хроніка
Пралетары — Мастацкі фільм Пятнаццае шчасьце
Дзённы дзіцячы сэанс ТВАРАМ да ТВАРУ
СПАРТАК — Выдатны фільм Трыпольская трагедыя
Каса—ад 1 г. дня — трагедыя ў 7 частках.

Менскі радыёвузел
да водзіць да ведамы ўсіх грамадзян і арганізацый гор. Менску і яго раёну, што можаць
лямпавыя радыё-ўстаноўкі
і кажадаючых абслугоўвацца, што яны павінны аб гэтым да 1-га студзеня 1933 году
падаць заяўкі ў Менскі радыёвузел,
бо без заявы пасьля ўказанага тэрміну ні адна радыёўстаноўка абслугоўвацца ня будзе.
Кошт за абслугоўваньне па горану—15 р. у месяц і раёне—20 руб.
Менскі радыёвузел.

МЕНДЗЯРЖТЭАТР
25 сьнежня адбудзецца
ВЯЛІКІ СЫМФАНІЧНЫ КАНЦЭРТ
аркестру Беларкамітэту радыёвяшчаньня
Пад кір. дырыжэра І. А. ГІТГАРЦА.
ПРЫ ЎДЗЕЛЕ:
Н. ПЕРАЛЬМАНА—
ўдзельніка сусьветнага конкурсу піяністаў у Варшаве ў 1932 г.
і віяланчэліста Герц ЦОМЫК.
Білеты ў раб. касе і ў касе тэатру.

У мэтах лепшага забясьпячэньня насельніцтва г. Менску роддапамогай,
з 22-га сьнежня 1932 г.
УВОДЗІЦЦА раёнаваньне роддапамогі
Ў НАСТУПНЫМ ПАРАДКУ:
1. Насельніцтва, якое жыве ў раёнах Камароўскай і Парэсьпянскай паліклінік, абслугоўваецца роддапамогай рэдзільным аддзяленьнем онушорсна-гінэкалёгічнай клініні (Барысаўскі шлях, Клінічны гарадок, 3-ці корпус).
2. Насельніцтва, якое жыве ў раёне Ляхаўскай паліклінікі, і частка насельніцтва, якое жыве ў раёне цэнтральнай рабочай паліклінікі, г. зн.—ад Ленінскай вул. да Эльвода, абслугоўваецца роддапамогай 1-м рэдзільным домам (Першамайская, 8).
3. Насельніцтва, якое жыве ў раёне 2-й рабочай паліклінікі, і частка насельніцтва, якая жыве ў раёне ЦРП,—г. зн. ад Ленінскай вул. і вышэй,—роддапамогай абслугоўваецца цэнтральным рэдзільным домам (Валадарскага, 10).
4. Рожаніцы, прыманаваныя па тэрыторыяльным распаляжэньні месца жыхарства да вышэйпаменаных роддамоў у іншыя рэдзільныя дамы (не свайго раёну)
ПРЫМАЦЦА НЯ БУДУЦЬ.
ГАРЗДРАЎ.

ПЛЯНАВА-ЭКАНАМІЧЫ ІНСТЫТУТ
сумесна з цэнтральным домам тэхнікі
НАЛАДЖВАЕ
публічную ЛЕКЦЫЮ-КАНСУЛЬТАЦЫЮ
заг. катэдрай плянаваньня і тэхнарманаваньня інстытуту тав. АНСЕЛЬРОДА Е. С.
НА ТЭМУ:
„ТЭХПРАМФІНПЛЯН, ПАРАДАК І МЭТАДЫ ЯГО СКЛАДАНЬНЯ".
Лекцыя-кансультацыя адбудзецца 23 сьнежня, у 8 гадз. вечара, у 317 аўдыторыі плянава-эканамічнага інстытуту (Ушорскага гарадок, Савецкая, супроць Дому Ураду).
Запрашаюцца ўсе ІТР, навуковыя работнікі, эканамісты, плянавікі, ТНВісты, студэнты і рабочыя прадпрыемстваў г. Менску.
Плянава-эканамічны інстытут і кансультацыйны бюро цэнтральнага дому тэхнікі.

ПРЫ ЦЭНТРАЛЬНЫМ ДОМЕ ТЭХНІКІ
(КАМСАМОЛЬСКАЯ, 25)
адкрыты вячэрнія без адрыву ад вытворчасьці
канструктарска-чарцёжныя КУРСЫ
для рабочых, асабліва для членаў т-ва вынаходцаў. Прыём курсантаў ад 7 да 8 гадз. вечара
Аргсход курсантаў адбудзецца 22 сьнежня, у 7 гадз. вечара.
АДКРЫТА
ПРАЕКТНА-КАНСТРУКТАРСКАЕ БЮРО
па тэхнічным афармленьні вынаходзтваў, удасканаленьняў і рац. прапаноў (складаньне праектаў, рабочых чарцяжоў, кештарысаў і інш.).
Прыём габінэту № 7 ад 12 да 2 г. дня і ад 7 да 8 гадз. вечара.
Дырэкцыя ЦДТ.

У аддзел аб'яў зваініце па тэлефону 7-81

Аргбюро „НІТО" будаўнікоў
24 сьнежня, у 7 гадз. вечара, у цэнтральным
ДОМЕ ТЭХНІКІ
(Камсамольская, 25)
АДБУДЗЕЦЦА
лекцыя-кансультацыя
інжынера-дзяржпляна Беларускага Будаўнічага Інстытуту Э. Х. Адальсіага
НА ТЭМУ:
„Значэньне мантажу пры працы ў сыстэме цэнтральнага ацяпленьня".
Запрашаюцца: ІТР, рабочыя Сантэхбуду і інш. будаўнічых арганізацый. Уваход вольны.
Аргбюро „НІТО" будаўнікоў.

МЕНСКІ
МАЛОЧНА-ПРАМЫСЛОВЫ ТРЭСТ
арганізуе ў г. Менску
3-месячныя КУРСЫ па падрыхтоўцы
ТЭХНІКАЎ-НАРМОЎШЧЫКАЎ для работы ў савгасах Менмалпрамтрэсту.
На курсы прымаюцца асобы ва ўзросьце ад 18 год., якія маюць асьвету ў аб'ёме 7-годн. Могуць быць прыняты асобы з асьвітой менш 7-годн., але знаёмыя з нармаваньнем або рабочыя з значным вытворчым станам і належнай падрыхтоўкай.
Курсанты забясьпечваюцца стыпэндыяй, інтэрнатам і сталоўкай.
Жадаючыя паступіць на курсы павінны падаць у сэктар кадраў Менмалпрамтрэсту (Савецкая, 70) заяву і наступныя дакументы: даведку аб адукацыі, даведку аб сац. паходжаньні і становішчы, даведку аб стане здароўя, засвечаную анкету і дарэкамендацыі аб апошняй рабоце.
Заявы з дакументамі прымаюцца
да 25 сьнежня.
Сэктар кадраў Менмалпрамтрэсту.

Усебеларуская кантора
ДЗЯРЖБАНКУ
абвяшчае дадатковы набор
на 5-месячныя КУРСЫ ПЛЯНАВІКОЎ
і вучотна-апрацоўчых работнікаў.
Тэрмін прыёму заяў з засьведчанымі анкетамі да 28-га сьнежня г. г.
Курсанты забясьпечваюцца стыпэндыяй у разьмеры акладу пэнсіі або на менш 10 руб. у месяц, квэтэрнымі і сутачнымі, на утрыманьні (для прыежджаных), дармовым інтэрнатамі і сталоўкай.
Прынятыя курсанты абавязаны па сканчэньні курсаў пракаваць у сыстэме Дзяржбанку на менш 2-х год.
Заявы прымаюцца ва ўсіх аддзяленьнях Дзяржбанку ў гарадох і раёнах і ў сэктары кадраў усебеларускай канторы Дзяржбанку (Менск, пр. Леніна, 1 і Савецкая вул. 6).
Усебеларуская кантора Дзяржбанку.

Мсьціслаўскі ВУЧОТНА-ФІНАНСАВЫ ТЭХНІКУМ
Наркамазему БССР
АБВЯШЧАЕ
ДАДАТКОВЫ НАБОР СТУДЭНТАЎ
на 1-шы курс тэхнікуму і чарговы прыём у центр. падгасшкоў работы вучоту.
Курс навучаньня ў тэхнікуме—3-гадовы. Прымаюцца на ўзросьце ад 17 да 35 год. Усе паступаючыя без выключэньня падлягаюць іспытам у аб'ёме 7-годн. Прадстаўляць дакументы, згодна даведніка НКА і выключна ў арыгіналах.
Прыём заяў у ЦКШ раб. вуч.—6 кас. Узрост рабочых ад 17 да 38 год. Адукацыя на ніжэй 4-годн. Пры заяве ў школу павінны быць наступныя дакументы: аб адукацыі, аб узросьце, сан. абановаішчы, стане здароўя, анкета, засьведчаная сяльвыконкамам калгасу або парт., проф. земаўпр. ці інш. адпаведна рэарганізаванай.
Зачынены ў тэхнікум і ў школу забясьпечваюцца стыпэндыяй і стыпэндыяй, згодна норм НКОсвіты і інтэрнатам і сталоўкай.
Прыём заяў у тэхнікум да 1-га студзеня і ў школу да 15 студзеня 1933 г. Да заяў або пісьмо, зрэдэтэрнаў абавязкова далучыць на 45 кап. пазнаў. марак. Заявы з дакумэнтамі накіроўваць на адрас: г. Мсьціслаў. Савецкая вул. 11-3, дырэктару тэхнікуму або ЦКШ Раб. Вуч.
Без атрыманьня спец. выклікі ад дырэкцыі—на вучобу не выязджаць.
ДЫРЭКЦЫЯ.

Менск, друкарня «Зьвязда». Галоўлітбел № 336.